Не дапусьціць зрыву зяблёва і раньняга пасеву азімых

ТОЛЬКІ 7 РАЁНАЎ ПАЧАЛІ СЯЎБУ і 19 РАЁНАЎ ПРЫСТУПІЛІ ДА ЗЯБЛІВА

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 231 (4136)
СЕРАДА 26 жніўня
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫНКНА.

Да пленуму ЦСПСБ

Пленум ЦСПСБ, які адкрыўся ўчора, займаецца абгаварэньнем выключна важных па сваёй актуальнасьці пытаньняў. Да асноўных з іх адносяцца пытаньне аб выкананьні прамфінпляну па прамысловасьці ВСНГ і НКС, пытаньне аб выніках перабудовы спажыўкаапэрацыі.

Народная гаспадарка БССР і ў прыватнасьці не прамысловы сэктар амаль заканчвае трэці і падыходзіць да чацьвертага кварталу, які зьяўляецца заваршаючым у выкананьні прамфінпляну трэцяга рашаючага году ў цэлым. Больш таго, надыходзячы чацьверты квартал будзе зьяўляцца правер'ем чацьвертага. па сутнасьці заключнага году пяцігодкі.

Ліпеньскі пленум ЦК КП(б)Б, адзначаючы ў сваёй пастанове па дакладу аб выкананьні прамфінпляну за першае паўгодзьдзе далейшыя дасягненьні ў справе індустрыялізацыі БССР, разам з тым з поўнай выразнасьцю адзначыў, што «выніку выкананьня прамфінпляну за 5 месяцаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі (студзень — май 1931 г.) зьяўляюцца нездавальняючымі». Пленум, апрача ацэнкі, выкрываў усе сапраўдныя прычыны прарываў. мабілізуючы гэтым самым партыйныя. гаспадарчыя і прафэсыянальныя арганізацыі на барацьбу з прарывамі.

Ліпень месяц зьявіўся ў некаторай меры пераломным. Валавая прадукцыя па прамысловасьці ВСНГ за гэты месяц дала рост на 10 проц. у параўнаньні з чэрвенем. У асобных галінах прамысловасьці, у прыватнасьці ў адной з найбольш важных з іх — у тарфяной, — пачынаецца іменна з гэтага месяца некаторы зрух, які яшчэ больш пашыраецца ў наступны жнівень месяц. Напрыклад, за адзін толькі ліпень месяц сэзонная праграма па ТОРФАЗДАБЫЧЫ выканана на 17,6 проц. супроць 16,2 проц. выканаўня за ўсе месяцы, разам узятыя, да ліпеня. Жнівень дасьць новае павялічэньне сярэднясутачнага выкананьня праграмы ў 0,75 проц. супроць сярэдня-сутачнага выкананьня яе ў 0,57 за ліпень.

Тым ня менш, тэмпы работы прамысловасьці, у прыватнасьці ТАРФЯНОЙ, КЕРАМІЧНАЙ, асабліва ЦАГЕЛЬНАЙ, а таксама ШКЛЯНОЙ, МЭТАЛЯПРАЦОЎЧАЙ застаюцца яўна НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМІ. Прамфінплян за 7 месяцаў выканан па ВСНГ толькі на 84,5 проц., па 8 аб'яднаньнях НКС за 6 месяцаў — толькі на 73,8 проц.

Прафсаюзы, закліканыя арганізаваць жывую і практычную дзейнасьць многіх соцень тысяч членаў саюзу БССР, многіх дзесяткаў тысяч прамысловых пралетараў нашых фабрык і заводаў, у поўнай меры адказваюць перад партыяй і ўсёй краінай за кожны недавыкананы процант прамфінпляну. У гэтай-жа сувязі стаіць пытаньне аб прарывах у выкананьні якасных паказальнікаў.

Якасныя паказальнікі, як па прамысловасьці ВСНГ, так і НКС (у прыватнасьці, паказальнік зьніжэньня сабекошту, які складае па прамысловасьці ВСНГ за 5 месяцаў 0,4 проц. замест вызначаных плянам 8,1 проц.). ня выкананы. Гэта зьяўляецца ў вялікай ступені вынікам таго, што ўвага прафорганаў ішла часта міма кардынальных праблем прамысловасьці: наладжаньне правільных суадносін паміж прадукцыйнасьцю працы і зарплатай, пытаньняў рацыяналізацыі, эканоміі матэр'ялаў, апалу, барацьбы з бракам і інш.

З гэтымі паказальнікамі яшчэ горш стаіць справа па прамысловасьці НКС, дзе замест зьніжэньня ў 7.1 проц. фактычна ёсьць павялічэньне сабекошту на 4,7 проц.

Такое становішча паказвае, што побач з няўменьнем раду гаспадарчых, органаў па-сапраўднаму гаспадарыць, асобныя прафарганізацыі выяўлялі і зараз яшчэ выяўляюць няўменьне ўхапіцца за асноўнае зьвяно, узначаліць усё больш узрастаючую ініцыятыву шырокіх мас рабочай клясы, па-сапраўднаму абалерціся ў штодзённай рабоце на рабочага ўдарніка і вышэйшыя формы сацыялістычнага спаборніцтва («сквозные» брыгады, зьменнае планаваньне, ударны цэх, брыгады гаспадарчага разрахунку і г. д.).

Рад прадпрыемстваў па прамысловасьці ВСНГ, асобныя галіны прамысловасьці НКС, аднак, ня толькі выканалі, але і ПЕРАВЫКАНАЛІ свой прамфінплян. Гэта толькі са ўсёй сілай падкрэсьлівае РЭАЛЬНАСЬЦЬ нашых плянаў, НАЯЎНАСЬЦЬ УСІХ МАГЧЫМАСЬЦЯЙ ДЛЯ ІХ ВЫКАНАНЬНЯ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЯ. Прарывы. якія ёсьць у радзе галін, наадварот, з поўнай выразнасьцю падкрэсьлівяюць, што яны (прарывы) — вынік нашага яшчэ няўменьня «ПА-НОВАМУ ПРАЦАВАЦЬ, ПА-НОВАМУ КІРАВАЦЬ».

Пленум на аснове пільнага разгляду прыроды гэтых прарываў у прамысловасьці БССР, павінен разам з тым, намеціць тыя канкрэтныя задачы, якія выцякаюць з новай абстаноўкі работы прамысловасьці, «якая патрабуе новых прыёмаў работы. новых прыёмаў кіраўніцтва» (СТАЛІН).

Для прамысловасьці БССР са ўсёй паўнатой паўстаюць задачы і барацьба з недахопамі, на якія паказаў т. Сталін на нарадзе гаспадарнікаў. На дзесятках прадпрыемстваў БССР ёсьць зьявішчы недапушчальнай ЦЯКУЧАСЬЦІ рабочай сілы. Па выбарачным абсьледаньні 60 прадпрыемстваў на працягу 1 кварталу прынята рабочых 16,2 проц. і за гэты-ж час пакінулі прадпрыемства 14,6 проц. Асноўнае зло — УРАЎНІЛАЎКА ў зарплаце — да гэтага часу яшчэ далёка ня выкарчавана. Сама сыстэма зараз існуючых тарыфаў прадстаўляе сабою патухаючую крывую і зусім зьнішчае задачу барацьбы з цякучасьцю, тармозіць ажыцьцяўленьне сыстэмы, «якая-б улічвала розьніцу паміж працай кваліфікаванай і некваліфікаванай, паміж працай цяжкай і працай лёгкай» (СТАЛІН).

Аднак, тэмпы работы прафсыянальных і гаспадарчых арганізацый у справе перагляду існуючай сыстэмы, перагляду пачасоўшчынкаў на неабмежаваную простую зьдзельшчыну вельмі невыстарчальны. Пераход на ПРАГРЭСЫЎНА - ПРЭМІЯЛЬНУЮ СЫСТЭМУ аплаты зрабіў толькі свае першыя крокі па радзе прадпрыемстваў Менску, Гомелю, асобных тарфяных заводаў і г. д.

Блытаніна на радзе прадпрыемстваў з БЕСЬПЕРАПЫНКАЙ, мэханічны пераход на бесьперапынку бяз усякай адпаведнай падрыхтоўкі, «скользящие» зьмены — ператвараюць сотні варштатаў у абязьлічаныя. За 4 месяцы 1931 году па цэнзавай прамысловасьці БССР на аднаго рабочага падае фактычнай работы 83,3 проц. Прагулы па няўважлівых прычынах у параўнаньні з адпаведным пэрыядам мінулага году павялічыліся на 1 рабочага ў 3 разы (з 0,32 на 0,96).

Вельмі сумны малюнак у цэлым радзе галін прамысловасьці (торф, лясной, буд., дартранспарт) наглядаецца ў справе ВЫКАРЫСТАНЬНЯ МЭХАНІЗМАЎ, АДНОСІН ДА МЭХАНІЗМАЎ. Частыя паломкі, неахайныя адносіны да мэханізмаў цягнуць за сабою тэхнічныя прастоі, пагоршэньне якасьці і разам узятыя націскаюць цяжкім грузам на колькасныя і якасныя паказальнікі прамфінпляну.

Асноўная рухаючая сіла ў справе выкананьня народна-гаспадарчага пляну — САЦСПАБОРНІЦТВА, — ня гледзячы на колькаснае нарастаньне ўдарніцтва, вельмі часта не знаходзіць даволі моцнага кіраўніцтва з боку прафорганаў.

Адна з найбольш высокіх і канкрэтных форм сацспаборніцтва — АРГАНІЗАЦЫЯ ГАСПАДАРЧА - РАЗРАХУНКОВЫХ БРЫГАД — пачынае пакуль што рабіць толькі свае першыя ўпэўненыя крокі («Бальшавік», завод імя Варашылава, фабрыка «Кастрычнік», Сельмаш, «Пралетары», «Кал. праца»), усё яшчэ сутыкаючыся вельмі часта з адміністрацыйным падыходам гаспадарніка, а часта з поўным тупым неразуменьнем і недвацэнкай гэтай важнейшай формы сацспаборніцтва. У вельмі многіх выпадках перавод прадпрыемстваў і цэхаў на ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК усё яшчэ вельмі фармальны. Зусім мала зроблена ў галіне аўладаньня тэхнікай, у арганізацыі шырокай вытворча-тэхнічнай прапаганды. Вось тыя вузлавыя моманты. без неадкладнага і настойлівага перамаганьня якіх з боку прафсаюзных арганізацый усякія «закліканьні і прызывы» будуць дарэмнымі.

Пытаньнем, цесна зьвязаным з задачамі выкананьня народна-гаспадарчага пляну трэцяга рашаючага году зьяўляецца пытаньне аб рабоце каапэрацыі, паляпшэньні забесьпячэньня рабочых. «Сёньня рабочы, наш савецкі рабочы хоча жыць з пакрыцьцём усіх сваіх матар'яльных і культурных патрэб...» (Сталін).

У задачы пленуму ўваходзіць — самым строгім чынам праверыць ступень перабудовы і падрыхтаванасьці каапэрацыі да гэтых павышаных і зусім канчатных патрабаваньняў рабочай клясы. У першачарговыя і простыя задачы пленуму, прадстаўнікоў ЦП і перш за ўсё прадстаўнікоў ФЗК, рабочых-ударнікаў, якія прымаюць удзел у пленуме ЦСПСБ, уваходзіць — браць пад лупу ня толькі дзейнасьць непасрэдна каапэрацыйных органаў, але і работу саміх прафарганізацый у справе паляпшэньня сацыяльна-бытавых умоў рабочай клясы БССР.

Практыка штодзённай барацьбы прафсаюзаў за лепшае рабочае забесьпячэньне. за лепшую пастаноўку работы ў ЗРК, за лепшае забесьпячэньне ў першую чаргу ўдарніка, за здаровую страву ў сталоўцы, за чыстату ў сталоўцы, у цэху, у рабочым памяшканьні — усё гэта павінна быць адлюстравана з найбольшай паўнатой.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб грамадзкім харчаваньні павінна неадкладна стаць перад прафсаюзамі канкрэтнай праграмай, выточным пунктам у справе напружанай барацьбы за паляпшэньне рабочага забесьпячэньня.

Па спэцыяльна заспуханым на пленуме пытаньні аб ПЕРАБУДОВЕ ПРАФРАБОТЫ павінны быць намечаны далейшыя шляхі ўдакладненьня мэтадаў і прыёмаў прафработы і кіраўніцтва на аснове пастановы 5-га пленуму УсеЦСПС.

Пленум ЦСПСБ у агульным ліку пытаньняў павінен са ўсёй выразнасьцю намеціць практычныя шляхі і канкрэтныя задачы, якія стаяць перад прафсаюзамі Беларусі ў справе выкананьня і перавыкананьня народна-гаспадарчага пляну трэцяга рашаючага году. Пленум павінен мабілізаваць і ўзьняць яшчэ на вышэйшую ступень арганізаваную волю дзесятнаў тысяч пралетараў БССР на падрыхтоўку ва ўсеўзбраеньні да абгаварэньня і СУСТРЭЧНАГА ПЛЯНАВАНЬНЯ КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ 1932 Г.

Ва ўсёй сваёй рабоце пленум павінен цьвёрда памятаць словы праведыра партыі тав. Сталіна: «Рэальнасьць нашай праграмы — гэта жывыя людзі, гэта мы з вамі, наша воля да працы, наша гатоўнасьць працаваць па-новаму, наша рашучасьць выканаць пляны» (Сталін).

На аснове ператварэньня пастановы чэрвеньскага пленуму ЦК КП(б)Б у дзейнасьць мільённай, народна-гаспадарчы плян БССР можа і павінен быць выкананы і перавыкананы.

Засеяна азімых 0,3 проц.

Паводле пастановы бюро ЦК КП(б)Б, сяўба азімых у паўночных раёнах павінна была пачацца 15 жніўня, у цэнтральных—20 і паўднёвых — 25 жніўня. У адпаведнасьці з гэтымі тэрмінамі кожная група раёнаў павінна скончыць сяўбу на працягу 10 дзён. Між тым, як паказваюць даныя зводкі НКЗБ на 20 жніўня, сяўба азімых пачалася толькі ў 7 раёнах. Агульны плян сяўбы па рэспубліцы выкананы за першыя 5 дзён усяго на 0,3 проц.

Гэтыя факты з усёй відавочнасьцю паказваюць на апартуністычную недаацэнку раньняй сяўбы азімых у цэлым радзе месц. Паўночныя раёны павінны былі першымі паказаць узор бальшавіцкай барацьбы за раньнюю сяўбу і сваячасовага выкананьня плянаў сяўбы азімых. На справе мы маем зусім адваротнае. З 16 паўночных раёнаў толькі адзін Сурасскі раён пачаў сяўбу, астатнія-ж раёны ганебна бязьдзейнічаюць

Першая пяціднёўка сыгналізуе нам аб пагрозе зрыву раньняй сяўбы азімых, што можа сарваць барацьбу за павышэньне ўраджайнасьці.

Сьледам за паўночнымі раёнамі масавая сяўба павінна пачацца і ўжо праходзіць у цэнтральных і паўночных раёнах. Між тым, як гаворяць факты з месц, падрыхтоўчая работа ў радзе раёнаў на сёнешні дзень яшчэ ня скончана. Не падрыхтавана глеба пад азімыя, не ачышчана насеньне, не адрамантаван увесь с.-г. інвэнтар. Завоз угнаеньня праходзіць таксама марудна

Задача ўсіх раённых арганізацый—ліквідаваць усе гэтыя недахопы і неадкладна дабіцца рашучага пералому ў ходзе асеньняй сяўбы, забясьпечыўшы раньнюю сяўбу азімых

Разгортваньне ЗЯБЛІВАЙ КАМПАНІІ таксама праходзіць чарапашымі тэмпамі. Зяблёва пачалі толькі 19 раёнаў і паднялі 0,2 проц. вызначанай плошчы. МТС выканалі свой плян усяго на 4,1 проц.

Зяблёвае ворыва—ня менш адказная гаспадарча - палітычная кампанія. Ня гледзячы на гэта, заданьне партыі і ўраду па выкананьні гэтага важнейшага мерапрыемства, якое павінна забясьпечыць павышэньне ўраджайнасьці скрозь і ўсюды, па апартуністычнаму ігнаруецца і адкладваецца ў апошнюю чаргу.

Раённыя арганізацыі павінны мабілізаваць усе сілы і побач з барацьбою за правядзеньне раньняй сяўбы азімых змагацца за поўнае выкананьне плянаў зяблёвага ворыва. Раённыя арганізацыі павінны памятаць, ШТО БАРАЦЬБА ЗА ЗЯБЛІВА — БАРАЦЬБА ЗА ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ У КАЛГАСАХ І САЎГАСАХ. Выкананьне пастаўленых задач зьявіцца руйнуючым ударам па кулаку і яго вгенце — апартуністу, будзе лепшым паказальнікам работы па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў

Трактар выяжджае на зяблёва.

6 МТС не пачалі зяблёва

Мы ўжо завастрылі ўвагу на тым, што зяблёва па МТС ідзе надзвычай марудным тэмпамі. Здавалася-б, што МТС улічаць сыгналы друку і возьмуць сапраўдныя тэмпы, якія забясьпечаць выкананьне пляну зяблёва. МТС павінны ўзяць пад зяблёва, паводле канчатковага пляну Наркамзема, 260 тыс. гэкт. Апошняя дэкада не дала належнага зруху. На 20 жніўня МТС узялі 7.409 гэкт. зяблёва — 4,1 проц. пляну.

Магілеўская, Аршанская, Дубровенская, Вушацкая, Расонская і Асьвейская МТС яшчэ не пачалі зяблёва. Церахаўская МТС выканала 1 проц. свайго заданьня, Мсьціслаўская—1,5 проц., Лёзьнянская—1,5, Сенненская—1,9 і Касьцюковіцкая—1,9 проц. пляну.

Асабліва трэба падкрэсьліць тое, што ўздым цаліны не заняў належнага месца ў МТС. Цаліны ўзьнята толькі 2.097 гэкт. Рад МТС, якія пачалі ворыва, аруць толькі асвоеныя землі, а паліны абыходзяць. Жытковіцкая, Гарадоцкая, Мсьціслаўская, Шклоўская і Горацкая МТС ніводнага гэктара цаліны яшчэ не ўзаралі.

Трэба пакончыць з недаацэнкай зяблёвага ворыва. МТС павінны неадкладна пераключыцца на зяблёвае ворыва і паставіць яго цэнтральнай задачай барацьбы за ўраджай.

Б. Х.

Машыны валяюцца, насеньне не ачышчана

КРУПКІ. Надыйшла асеньняя сяўба, але Крупскі раён да сяўбы не падрыхтаваўся. Яшчэ ня ўсе калгасы скончылі ўздым папару. Толькі ідзе малацьба насеньня. Аб збожжаачыстцы ніхто ня думае. Збожжаачышчальныя машыны ў калгасах валяюцца абыдзе.

У некаторых мясцох адпаасобнікам яшчэ не адведзен азімы клін.

Крупскія раённыя зямельна-калгасныя органы павінны неадкладна ўжыць рашучыя меры, каб ліквідаваць усе гэтыя прарывы.

Веснавы.

Пачалася сяўба азімых

УВАРАВІЧЫ. Некаторыя калгасы Ўва равіцкага раёну ўжо пачалі асеньнюю сяўбу. Калгас імя Будзённага засеяў 3 гэкт. жыта.

А. КАЗІМІРАЎ.

Сяўбу адкладваюць

ЛЕПЕЛЬ. (Ад наш. спэц. кар.). У раёне панае апартуністычная недаацэнка раньняга пасеву азімых. Рад калгасаў мяркуе скончыць сяўбу 10-15 верасьня.

Паасобныя калгасы пачалі сяўбу са спазьненьнем. Калгас імя М. Горкага засеяў 4,5 гэкт., а паводле пляну, ён павінен засеяць 100 гэкт.

МІКУЦКІ.

Зямля аднаасобнікам не адведзена

ТАЛОЧЫН. Друцкі сельсавет яўна недаацэньвае пасеву азімых у аднаасобным сэктары. Яшчэ да гэтага часу не адведзен азімы клін для аднаасобнікаў у пасёлку Стары-Друцак. Па ўсіх вёсках гэтага сельсавету пляны асеньняй сяўбы не даведзены да вёсак.

З боку старшыні сельсавету праяўляюцца бюракратычныя адносіны, калі да яго зварачаюцца сяляне, каб хутчэй адвялі зямлю. Ён адказвае: «Я вам не каморнік і да мяне не зьвяртайцеся». Партыйная ячэйка не зварачае ўвагі на такія зьявішчы з боку старшыні сельсавету.

Неабходна тэрмінова спыніць правааартуністычную працу Друцкага сельсавету.

Селькор В. А. В.

Рыхтаваць глебу пад азімыя яшчэ не пачыналі

МАГІЛЕЎ, 23. (БЕЛТА). Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы па раёне прахо дзіць ганебна марудным тэмпамі. Складаньне насеньных фондаў і ачыстка насеньня праведзены на 40 проц.

З боку райза і райкалтасавету і некаторых праўленьняў калгасаў 1 сельсветаў наглядаецца апартуністычная недаацэнка асеньняй сяўбы. Замест жывой сувязі і ацэрацыйнага кіраўніцтва існуе канцылярская пісаніна. Ні адна з раённых арганізацый ня ведае, колькі інвэнтару адрамантавана і колькі яго ў раёне ёсьць. Амаль ні адзін калгас не прыступіў да падрыхтоўкі глебы пад азіміну.

Калгаснае жыта зьвезьці ў гумны

ЛЕПЕЛЬ. (Наш. спэц. кар.). У выніку таго, што ў раёне ў радзе калгасаў не праведзена аграмаджаньне пасеваў новаўступіўшых калгаснікаў, наглядаецца зацяжка з уборкай збожжавых. На 20 жніўня ўбрана ўсяго 10 проц. збожжавых. Пасевы калгаснікаў, якія не аграмаджаны, убіраюцца ў першую чаргу і складаюцца ў азяроды.

Вакол сваячасовай звозкі і сьцірталньня збожжа калгасаў у раёне не завострана ўвага. У калгасах збожжавыя застаюцца на полі і ня звозяцца ў гумны. У некаторых мясцох кулацка-заможныя элементы, стараючыся падарваць моц калгасаў, супраціўляюцца звозцы збожжа ў гумны.

МІКУЦКІ.

КУЛАКІ У КАЛГАСЕ

СІРОЦІНА. У Сіроцінскім раёне арганізаваўся калгас «Ударнік» з 10 гаспадарак, у складзе якіх 5 гаспадарак кулацкіх. Гэта кулацкая частка павяла работу па падрыве арганізацыйна - гаспадарчага стану калгасу і дабілася свайго. Сродкі вытворчасьці ў калгасе да гэтага часу яшчэ не аграмаджаны, ня гледзячы на тое, што бяднацкая частка ставіла пытаньне аб аграмаджаньні асноўных сродкаў вытворчасьці.

Кулакі далей праводзяць сваю палітыку. Скошанае сена ў калгасе падзелена па 100 пудоў на карову. Дзейнасьць гэтых кулакоў добра вядома сельсавету, але апошні на прымае ніякіх мер. Раённыя арганізацыі павінны неадкладна ачысьціць калгас ад кулакоў.

А. МІКУЦКІ.

РЭАЛІЗУЕМ АДОЗВУ ЦК і СНК АБ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

12.700 СЬВІНАМЕСЦ— БУДАВАЦЬ КОЖНУЮ ДЭКАДУ!

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ БЕСЬПЕРАБОЙНУЮ ПАДВОЗКУ ЛЕСАМАТАР'ЯЛАЎ ДА ПАБУДОЎ

ДА АДКАЗНАСЬЦІ ВІНАВАТЫХ У ЗРЫВЕ БУДАЎНІЦТВА У САЎГАСАХ: „ВІШНЁУКА", „ВЫЗВАЛЕНЬНЕ", імя БУДЗЁННАГА і імя 14 ПАРТЫЗАН

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у сваёй пастанове аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі падкрэсьліваюць, ШТО «БУДАЎНІЦТВА ПАМЯШКАНЬНЯЎ ДЛЯ РАЗЬМЯШЧЭНЬНЯ ЖЫВЁЛЫ Ў САЎГАСАХ І КАЛГАСАХ ПАВІННА БЫЦЬ ЗАКОНЧАНА НЕ ПАЗЬНЕЙ 15 ЛІСТАПАДА».

Між тым, ход будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах не забясьпечвае выкананьня дырэктывы партыі і ўраду ў тэрмін.

Па-першае, трэба падкрэсьліць, што БЕЛСЕЛЬБУД, які вядае будаўніцтва ў саўгасах, дагэтуль не наладзіў апэрацыйнай справаздачнасьці аб ходзе будаўніцтва. Учора ў Белсельбудзе былі весткі аб ходзе будаўніцтва толькі на 1 жніўня. Кіраўнікі Белсельбуду фактычна блукаюць у цемры, ня ведаючы фактычнага стану рэчаў на пабудовах на сёнешні дзень.

Паводле пляну Белсельбуд у саўгасах Сьвінавода павінен пабудаваць да 15 лістапада 503 сьвінарнікі. На 1 жніўня ўсе гэтыя сьвінарнікі ўжо былі ў працэсе будоўлі, але скончана пабудовай было толькі 86 сьвінарнікаў, што складае каля 17 проц. гадавой праграмы.

У саўгасах ВІШНЁЎКА, ІМЯ 1 МАЯ, ЧЭРЫКАЎ, «ВЯЛЕНЬ-СІНЧА», ВЫЗВАЛЕНЬНЕ» і ІМЯ БУДЗЁННАГА будаўніцтва, выходзячы з плянаў камплектаваньня, павінна быць закончана ў першую чаргу. У гэтых саўгасах да наступленьня зімніх халадоў трэба сканцэнтраваць КАЛЯ 7.000 АДНЫХ СЬВІНАМАТАК апрача рэшты стада. Між тым, нават і ў гэтых саўгасах, дзе будаўніцтва зьяўляецца звышударным, БУДАЎНІЧАЯ ПРАГРАМА ВЫКАНАНА ТОЛЬКІ НА 3 ПРОЦ.

Асноўнай прычынай такога ганебнамаруднага ходу будаўніцтва зьяўляецца недахват будаўнічых матар'ялаў. З-за недахвату матар'ялаў, рабочыя ў гэтых саўгасах працуюць з нізкоўнай нагрузкай, не выпрацоўваюць сваёй нормы. У іншых саўгасах становішча ня лепшае, аб гэтым гаворыць наступныя лічбы. Калі ў чэрвені капітала-ўкладаньні на 1 рабочага-будаўніка дасягалі 380 руб., дык у ліпені—320 руб., а ў жніўні—яшчэ ніжэй. Гэта прыводзіць да адліву і цякучасьці рабочай сілы на пабудовах.

У саўгасах: імя 14 партызан, «Вызваленьне», імя Будзённага. «Вішнёўка» і імя 1 мая з-за адсутнасьці будаўнічых матар'ялаў і цьвікоў будаўніцтва фактычна спынена.

Дырэктары гэтых саўгасаў злачынна ня выконваюць заключаных імі дагавораў аб вывазцы лесаматар'ялаў, нават тады, калі і маюць магчымасьць гэта зрабіць. Так, дырэктар саўгасу імя Будзённага адмаўляецца вывозіць гонту для будаўніцтва сьвінарнікаў, матывуючы недахватам цягавай сілы. У тойжа час з 1 студзеня па 1 жніўня ў саўгасе было 2.294 конапрагулы. Дырэктар саўгасу «Вызваленьне» таксама адмаўляецца вазіць гонту. Такое-ж становішча і ва многіх іншых саўгасах.

Усе вышэйадзначаныя факты гаворяць толькі аб адным: Белсельбуд і беларускае аддзяленьне канторы Сьвінавода да гэтуль не арганізавалі апэрацыйнага кіраўніцтва ходам будаўніцтва ў саўгасах і ня ўжылі ўсіх мер, каб забясьпечыць сваячасовае яго завяршэньне.

Часу засталося мала. Неабходна зараз-жа, пад персанальную адказнасьць дырэктароў саўгасаў, забясьпечыць падвозку да пабудоў патрэбных лесаматар'ялаў, скарыстоўваючы ўсю вольную цягавую сілу саміх саўгасаў і сельсветаў.

Там, дзе сьвінарнікі ўжо выведзены пад дах і няма гонту і цьвікоў для кладкі даху, трэба зараз-жа накрываць сьвінарнікі саломай.

12.700 СЬВІНАМЕСЦ У КОЖНУЮ ДЭКАДУ—ВОСЬ БАЯВЫ ЛЁЗУНГ, ЯКІ ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ КОЖНЫ ТЭХНІК, КОЖНЫ ДЗЕСЯТНІК І РАБОЧЫ, ЗАНЯТЫ НА БУДАЎНІЦТВЕ. Толькі пры такіх тэмпах, пры разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва на пабудовах мы здолеем сваячасова выканаць дырэктыву партыі і ўраду.

Я. П-кі.

Лесаматар'ялаў не хапае, а коні гуляюць

ЧЭРВЕНЬ.

У саўгасе імя Будзённага, Чэрвеньскага раёну, да 15 лістапада павінна быць пабудавана 19 сьвінарнікаў і 7 жыльлёвых памяшканьняў.

Ня гледзячы на тое, што будаўніцтва сьвінарнікаў пачалося яшчэ ў мінулым годзе, дагэтуль ні адзін з іх ня скончан.

Кіраўніцтва саўгасу зусім ня цікавіцца ходам будаўніцтва і ня прымае ніякіх захадаў для сваячасовага забесьпячэньня будаўніцтва лесаматар'яламі. Наадварот, дырэктар саўгасу злачынна ня выконвае дагавору аб падвозцы лесаматар'ялаў, матывуючы недахватам цягавай сілы. Між тым, з 1 студзеня па 1 жніўня ў саўгасе было 2.994 дні коня-прагулаў.

На будаўніцтве за гэты час было 367 прагулаў. Начальнік будаўнічага вучастку МІРОНЕНКА зусім не зварачае ніякай увагі на якасьць будаўніцтва, якое не забясьпечана тэхнічным наглядам.

Брыгадзір «Зьвязды» САЕВІЧ.

Да 14 гадавіны Кастрычніка СКОНЧЫЦЬ БУДАЎНІЦТВА І КАМПЛЕКТАВАНЬНЕ

Калгас «ЧЫРВОНЫ РОЛЬНІК» Плешчаніцкага раёну, першым адгукнуўся на пастанову ЦК і СНК аб разгортваньні жывёлагадоўлі і высунуў свой сустрэчны плян

Да 1-га студзеня калгас павінен давесьці стада сьвінаматак да 100 штук. Калгаснікі абавязаліся закончыць укамплектаваньне сьвінагадоўчай фэрмы ў разьмеры 120 сьвінаматак (на 20 проц. звыш пляну) да 14-й гадавіны-Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Да 20-га кастрычніка кончыць будаўніцтва сьвінарніка і ізалятара, для чаго перакінуць па будоўлі яшчэ адну брыгаду цесьляроў.

Да 25-га жніўня выкапаць яшчэ адну сіласную яму на 25 тон

Калгас «Чырвоны рольнік» выклікае на сацыялістычнае спаборніцтва калгас імя ВАРАШЫЛАВА, які таксама мае сьвінагадоўчую ферму і вельмі адстае з камплектаваньнем і будаўніцтвам.

Па даручэньні агульнага сходу калгасу старшыня ЦЯЖУРА.
Сакратар КАЗАК.

Баявыя задачы прамысловай каапэрацыі

Партыя і ўрад радам сваіх пастаноў выразна акрэсьлілі напрамак дзейнасьці прамкаапэрацыі ў рэканструкцыйны пэрыяд.

XVI зьезд Усе КП(б) у рэзалюцыі аб выкананьні пяцігадовага пляну прамысловасьці, падкрэсьліў: «Пад пунктам гледжаньня ўзмацненьня скарыстаньня наяўных вытворчых магчымасьцяй павінны быць устаноўлены ўзаемадносіны паміж буйной дзяржаўнай прамысловасьцю і прамысловасьцю дробнай мясцовай і саматужнай. Дробная, мясцовая і саматужная прамысловасьць, асабліва каапэраваная, разгортваючы вытворчасьць рыначных вырабаў, павінна разам з тэтым служыць дадаткам да буйной прамысловасьці, вытвараючы па яе заданьнях рад дэталяй і паўфабрыкатаў і вызваляючы гэтым самым абсталяваньне буйной прамысловасьці ад такіх вытворчых апэрацый, якія могуць быць вытвараны ў дробных, саматужных і рамесьніцкіх прадпрыемствах».

У спэцыяльнай пастанове ЦК УсеКП(б) аб саматужна-прамысловай каапэрацыі ад 16 красавіка мінулага году, прамкаапэрацыі былі дадзены рад паказаньняў наконт перанясьненьня цэнтру цяжару работы на мясцовы недыфэцытны сырац, наконт пашырэньня гэтых промыслаў і арганізацыі новых, наконт каапэраваньня ўсіх саматужнікаў у калгасах і г. д. Зараз, калі партыяй пастаўлена пытаньне аб шырокім разьвіцьці лёгкай прамысловасьці, на аснове далейшага ўздыму цяжкай індустрыі, роля прамкаапэрацыі па забесьпячэньні насельніцтва прадметамі шырокага карыстаньня яшчэ больш павышаецца.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове ад 26 сакавіка г. г. і СНК БССР у пастанове ад 30 ліпеня г. г., выходзячы з мясцовых умоў, паставілі перад прамысловай каапэрацыяй БССР канкрэтныя задачы на барацьбе за прамфінплян бягучага году і вызначылі шляхі далейшага разьвіцьця.

Прамкаапэрацыя БССР за апошнія два гады мае значныя дасягненьні. У 1930 годзе беларуская прамкаапэрацыя дала прадукцыі па адпускных цэнах на 80 млн. рублёў. У гэтым годзе яна павінна даць на 179 млн. руб.

Беларуская прамкаапэрацыя аб'яднае ў сучасны момант да 45 тыс. членаў артэляй, з якіх 95 проц. працуе ў майстэрніх з аграмаджанымі сродкамі вытворчасьці, прычым каля 15 тыс. з агульнага ліку каапэравана ў вясковых арцелях і такая-ж колькасьць у месцачковых.

За апошнія паўтары гады пасьля правядзенай чысткі ад кулацкіх і нэпманскіх элементаў, склад арцеляй значна палепшыўся.

Работа прамкаапэрацыі за апошнія гады перабудавалася на такія важныя промыслы, як тарфяны, будматар'ялы, дрэваапрацоўка і лесахэмічны, якія базуюцца ў асноўным на мясцовым сырцу.

Ад выкананьня прамкаапэрацыяй сваіх прамфінпляў у значнай ступені залежыць выкананьне пляну раду галін буйной прамысловасьці, калгаснага будаўніцтва і абслугоўваньне галоўных патрэб рабочых і працоўнага насельніцтва. «Нельга разглядаць пытаньні, зьвязаныя з работай саматужнай і прамысловай каапэрацыі без сувязі з агульнай работай нашай прамысловасьці і агульным ходам выкананьня прамфінпляну» (з прамовы тав. Гея на зьезьдзе прамкаапэрацыі).

IV усебеларускі зьезд прамкаапэрацыі, які праходзіў у ліпені месяцы, зьвярнуў асноўную ўвагу на пытаньні выкананьня прамфінпляну сыстэмай прамкаапэрацыі. Зьезд канстатаваў, што прарывы, якія ёсьць у рабоце сыстэмы за першае паўгодзьдзе г. г. па будматар'ялах, па дрэваапрацоўцы, па лесахэміі і па торфе зьяўляюцца вынікам таго, што работа не перабудавана, вынікам анартуністычных адносін паасобных арганізацый і працаўнікоў прамкаапэрацыі да ўскладзеных на іх задач.

У прамкаапэрацыі да гэтага часу ў большасьці не перабудавана сыстэма заработнай платы. У артэлях панае абязьлічка і безадказнасьць за даручаную работу. Зусім нездавальняючы адбываецца перавод прадпрыемстваў на гаспадарчы разрахунак. Слаба пастаўлен улік і справаздачнасьць, асабліва ў выкананьні якасных паказальнікаў прамфінпляну. Культмасавая работа не прыстасавана да задач барацьбы за плян, за выкананьне задач сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

На працягу веснавой сяўбы прамкаапэрацыя дабілася некаторых посьпехаў у справе арганізацыі прамысловых арцеляй у калгасах і арганізацыі прамысловых калгасаў. Але побач з гэтым наглядаецца рад непаразуменьняў паміж калгасамі і прамарцелямі, якія тлумачацца неразуменьнем асобнымі калгасамі і райкалгасаюзамі важнасьці разгортваньня промыслаў у калгасах, на падставе арганізацыі ў іх самастойных, прамкаапэрацыйных арцеляй. Гэтакія непаразуменьні прывялі ў некаторых мясцох да ліквідацыі прамарцеляй, або да паслабленьня іх дзейнасьці.

Трэба пакласьці канец такім зьявішчам. Прамкаапэрацыйная сыстэма абавязана сканцэнтраваць сваю ўвагу на арганізацыі прамарцеляй у калгасах, асабліва ў раёнах суцэльнай калектывізацыі. Дзейнас

ТОРФАЗАВОД „ГРЭБЯНЕВА“ УБРАЎ І ВЫСУШЫЎ 80 ПРОЦАНТАЎ ЗДАБЫТАГА ТОРФУ

ДА ПЛЕНУМУ ЦСПСБ

МЕСЯЧНІК ПЕРАБУДОВЫ ПРАФРАБОТЫ НЯ ДАЎ ПАТРЭБНЫХ ВЫНІКАЎ

Пленум ЦСПСБ павінен вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па ўзмацненьні перабудовы прафарганізацый у адпаведнасьці з новымі ўмовамі гаспадарчага будаўніцтва

Апартуністычнае рэагаваньне на сыгналы „Зьвязды“

«Зьвязда» ня раз сыгналізавала аб прарывах у рабоце прафсаюзаў ГАРАДОЦКАГА РАЁНУ. Гарадоцкі райпрафсавет на ўсе сыгналы «Зьвязды» адказваў толькі пастановамі, але не забясьпечыў сапраўднай перабудовы прафсаюзаў у адпаведнасьці з новымі ўмовамі гаспадарчага будаўніцтва.

На сёньня можна канстатаваць, што прафсаюзная работа ў Гарадоцкім раёне НЕ ПЕРАБУДАВАНА. Гарадоцкі раён — ільнаводчы раён. У гэтым годзе засеяна 14.000 гэкт. ільну. У раёне будуецца 3 ільназаводы. Ёсьць машына-трактарная станцыя, будуецца рамонтная майстэрня для абслугоўваньня 10 МТС. Зусім відавочна, што прафсаюзная арганізацыя ў сваёй рабоце і павінна была выходзіць з напрамку разьвіцьця раёну. Між тым, удзел прафсаюзаў у разьвіцьці ільнаводчай гаспадаркі, у дапамозе разгортваньню будаўніцтва заводаў, у абслугоўваньні членаў прафсаюзаў надзвычай слабы.

Месячнік самаправеркі прафработы фактычна провален. Мясцком МТС, райкалгасаюзу, райза і інш. не перабудавалі сваёй работы. Ніводнае мерапрыемства, вызначанае па пляне (аб самаправерцы прафработы, аб сацспаборніцтве і інш.) не ажыцьцёўлена. Праўда, некаторыя пытаньні, як прамова тав. Сталіна, пастанова аб перабудове спажыўкаапэрацыі прапрацаваны, але ніякіх канкрэтных мерапрыемстваў у сувязі з імі ня вызначана.

Саюз будаўнікоў стаіць у баку ад важнейшых пытаньняў вытворчага жыцьця. Саюз ня цікавіцца становішчам на новабудоўлях. На лесазаводзе імя ВАРОЎСКАГА ёсьць рад прарываў. Разьвіты рвацкія настроі. Не перабудавана сыстэма зарплаты. Былі выпадкі, калі мэханікі выганялі па тысячы рублёў у месяц. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнута. На заводзе працуе шмат сэзоньнікаў, сярод якіх ніякай работы не вядзецца.

У перабудове работы спажывецкай кааперацыі, прафсаюзныя арганізацыі ня прымаюць ніякага ўдзелу. На будаўніцтве Ільназаводаў няма ніводнага ларка. Нават не нападжана дастаўка хлеба на будаўніцтва. Рабочым прыходзіцца хадзіць за хлебам у горад, трацячы на гэта шмат часу.

Райпрафсавет, замест канкрэтнага кіраўніцтва і дапамогі нізавым праф'ячэйкам, засыпае іх папяровымі дырэктывамі. Райпрафсавет не заслухаў на сваім пасяджэньні ніводнага дакладу ФЗМК.

Райком КП(б)Б павінен неадкладна зьнішчыць правапартыністычную практыку ў рабоце прафсаюзных арганізацый. Трэба паставіць на чале прафарганізацый такіх работнікаў, якія-б сапраўды перабудавалі работу тварам да вытворчасьці, у адпаведнасьці з новымі ўмовамі гаспадарчага будаўніцтва, якія выразна акрэсьлены ў прамове тав. Сталіна.

Зайцаў, Шаруба.

Аршанскі райпрафсавет ня ведае колькі саўгасных рабачкомаў у раёне

АРШАНСКІ РАЙПРАФСАВЕТ НІЯКАГА КІРАЎНІЦТВА І ДАПАМОГІ Ў РАБОЦЕ РАБАЧКОМАЎ САЎГАСАЎ НЕ АКАЗВАЕ. ЗАРАЗ ПА САЎГАСАХ САЮЗУ РАБОЧЫХ ЗЯМЛЯРОВЧЫХ САЎГАСАЎ І ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРКАХ ПРАВОДЗІЦЦА 2-ДЭКАДНІК ПРАВЕРКІ ВЫКАНАНЬНЯ КАЛДАГАВАРОЎ. ГЭТАМУ ВАЖНЕЙШАМУ ПЫТАНЬНЮ РАЙПРАФСАВЕТ ПАВІНЕН БЫЎ АДДАЦЬ МАКСЫМУМ УВАГІ. МІЖ ТЫМ, ЁН НАВАТ НЯ ПРЫНЯЎ УДЗЕЛУ Ў ІНСТРУКЦЫЙНАЙ НАРАДЗЕ СТАРШЫНЬ РАБАЧКОМАЎ, ЯКАЯ ПРАВОДЗІЛАСЯ Ў СУВЯЗІ З ПРАВЕРКАЙ КАЛДАГАВАРОЎ, РАЙПРАФСАВЕТ НЯ ВЕДАЕ, КОЛЬКІ САЎГАСАЎ ЁСЬЦЬ У РАЁНЕ. А ПА САЎГАСАХ ЁСЬЦЬ ЗНАЧНЫЯ ПРАРЫВЫ Ў ВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНАЎ. НАДЗВЫЧАЙ ДРЭННА ПАСТАЎЛЕН УЛІК ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ, АЛЕ НІЯКАЙ ДАПАМОГІ З БОКУ ПРАФСАЮЗНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ НЕ АКАЗАНА. У ДЗЬВЁХ ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРКАХ ЁСЬЦЬ КАЛЯ 100 УДАРНІКАЎ, З ІМІ НІХТО НЕ ПРАВОДЗІЦЬ НІЯКАЙ РАБОТЫ. У ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРКАХ НЕ РАЗГОРНУТА ЗУСІМ БУДАЎНІЦТВА.

УЛЕЗЛА.

Заўком не заўважыў цкаваньня ўдарніц...

Работніцы лесазаводу № 6 (Бабруйск) — Ядлоўская і Сакалоўская — перадавыя ўдарніцы. Яны паказваюць ва ўсім прыклад, прымаючы актыўны ўдзел і ў грамадзкай рабоце.

Гэта не спадабалася работнікам таго-ж заводу Тамашэўскай і Вайнэр, якія нядбайна адносяцца да працы, якія недавыконваюць заданьня. Яны сыстэматычна зьдзекваліся з ударніц. Справа дашла да таго, што Тамашэўская і Вайнэр пагражалі Ядлоўскай і Сакалоўскай, патрабуючы, каб яны перасталі па-ўдарнаму працаваць.

Калі аб гэтым даведаўся рабкор і напісаў у пасьценную газэту, кампанія Тамашэўскай вырвала артыкул і карыкатуру з пасьцengазэты.

Толькі пасьля таго, як заметка была сарвана, справай гэтай заняўся цэхавы камітэт. Як высьветлілася на пасяджэньні, аб памянёных фактах цкаваньня, была падана ў цэхком заява Ядлоўскай і Сакалоўскай яшчэ 7 лютага. Аднак цэхком не палічыў патрэбным умяшацца ў гэту справу, аддзелаўшыся фармальнай прапановай таварыскаму суду разгледзець гэту справу. Цэхком недаацаніў палітычнай важнасьці факта, не скарыстаў гэты факт для мабілізацыі ўсіх рабочых заводу на барацьбу з гультаямі, прагульшчыкамі.

С. КАГАН.

ПРАФСАЮЗЫ, КАМСАМОЛ, ЗАВОДЫ-СПАЖЫЎЦЫ!

АРГАНІЗУЙЦЕ СУБОТНІКІ ЎБОРКІ, СУШКІ І ВЫВАЗКІ ТОРФУ

ВЫКАНАНЬНЕ СЭЗОННАГА ПЛЯНУ ТОРФАЗДАБЫЧЫ

18 жніўня	19 жніўня	20 жніўня	21 жніўня
44,7	45,2	45,8	46,4

БССР дала 46,4 проц. сэзоннага пляну торфаздабычы

Сэзонны плян торфаздабычы па 22-х заводах Белторфу на 22 жніўня выкананы на 46,4 проц. Здабыта 325,249,8 тон торфу.

Ідуць наперадзе па выкананьні сэзоннага заданьня торфазаводы:

«Чырвоны тарфянік»	—	100,3 проц.
«Ленінскі шлях»	—	88,6 »
«Закрашынскі мох»	—	86,7 »
«Новая Беларусь»	—	77,0 »
«Бальшавік»	—	74,8 »

НА ПРАЦЯГУ ЎСЯГО СЭЗОНУ ГАНЕБНА АДСТАЮЦЬ:

«Вольніца»	—	6,8 проц.
«Рэмізава»	—	7,8 »
«Чырвоная Беларусь»	—	8,6 »
«Вялікі мох»	—	10,1 »
«Калектыўная праца»	—	13,5 »
«Смалявічы»	—	28,9 »

УБРАНА І ВЫСУШАНА ЗДАБЫТАГА ТОРФУ

КАМСАМОЛЬЦЫ МАГІЛЕЎШЧЫНЫ ДАПАМАГАЮЦЬ ТОРФАЗАВОДУ „ГРАБЯНЁВА“ ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ

МАГІЛЕЎ. (Па тэлетрафу).

Торфазавод «Грабянёва» сэзонны плян торфаздабычы на 22 жніўня выкананы на 48,0 проц.

Убрана і высушана 80 проц. здабытых тарфяных цаглін.

Зараз значную дапамогу ў рабоце торфазаводу па ліквідацыі прарываў аказвае магілеўская камсамольская арганізацыя.

З 23 жніўня на торфараспрацоўках працуе камсамольская брыгада з 50 чал. 29 жніўня гарком камсамолу высылае новую камсамольскую брыгаду на торфараспрацоўкі заводу «Грабянёва», таксама ў колькасьці 50 чал.

У задачу гэтых брыгад уваходзіць ня толькі дапамога ў ліквідацыі прарыву па здабытку торфу, але і перадача вопыту разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва, барацьбы за прамфінплян і правядзеньне падрыхтоўкі да МЮД'у ў ячэйцы торфазаводу.

Ліўшыц.

„Шлях сацыялізму“ абвясьціў дэкаднік штурму здабычы і сушкі торфу

Торфазавод «Шлях сацыялізму», ня гледзячы на правядзеньне раду мерапрыемстваў, па ўзмацненьні тэмпаў торфаздабычы, не дабіўся яшчэ рашучага пералому.

На 20 жніўня здабыта 63.706,7 тон торфу, што складае 50,9 проц. сэзоннага пляну.

Да канца сэзону засталося здабыць яшчэ звыш 50 тысяч тон торфу.

Гэта з усёй рашучасьцю ставіць пытаньне перад кіраўніцтвам торфазаводу і ў першую чаргу перад партыйнай арганізацыяй скарыстаць апошнія дні для сапраўды базавога штурму ігарыўаў торфаздабычы.

Вялікім тормазам у рабоце заводу вызначаецца ўсё яшчэ слаба разгорнутае ўдарніцтва і сацспаборніцтва. Рабочае забесьпячэньне і харчаваньне, ня гледзячы на прыняцьце раду мерапрыемстваў па яго паляпшэньні, і на сёньняшні дзень застаецца неадавальняючым. У сталоўцы ўвесь час не хапае гародніны. Якасьць абедаў не паляпшаецца. Былі і ёсьць значныя перабоі з забесьпячэньнем рабочых хлебам.

Самыя неабходныя прамтавары, як мыла, махорка і інш., дастаўляюцца на завод у нязначнай колькасьці.

Слаба разгортваюцца работы па новым будаўніцтве. Адсутнасьць піламатар'ялаў, бясплянавасьць у рабоце прывялі да таго, што адпрыцьцё [illegible] ФЗВ пастаўлена пад пагрозу.

Заводзкі трыкутнік, абтаварваючы такое становішча, прыняў рад мерапрыемстваў, накіраваных на ліквідацыю прарыву.

Дана жорсткая дырэктыва аб безадкладным пераводзе работы машын на тры зьмены, а іншую вольную рабсілу скарыстаць на ручной рэзцы.

Абвешчан дэкаднік штурму па фарсаванай здабычы торфу. Зьмена першай пяцідзённкі павінна даць у сярэднім штодзенна 40.000 тарфяных цаглін, а другую—ня менш 45.000 цаглін.

Асноўная ўвага зараз зьвернута на здабычу фрэзэрнага торфу, сэзон якога працягнут да 1 кастрычніка.

Ужыты меры да поўнай мэханізацыі работ як па здабычы торфу, так і па яго сушцы і ўборцы.

Разгорнута вялікая масавая работа па вамацаваньні наўчнай рабочай сілы да канца сэзону.

Ад спажыўца торфу, папяровай фабрыкі «Герой працы» торфазавод «Шлях сацыялізму» патрабуе ўзмацненьня культурнага і гаспадарчага шэфства.

Фабрыка павінна кінуць на торфазавод новыя рабочыя брыгады для аказаньня дапамогі ў сушцы, уборцы і вывазцы.

Ап.

НАСУСТРАЧ НАВУЧАЛЬНАМУ ГОДУ

Падручнікі вандруюць па выдавецкіх нэтрах

Белкаапсаюз па-ранейшаму

ЗРЫВАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ РАЁНАЎ АБУТКАМ І ВОПРАТКАЙ

РСІ ПАВІННА ПАКЛАСЬЦІ КАНЕЦ ГЭТЫМ БЯСЧЫНСТВАМ

ПАТРАБУЕМ УМЯШАНЬНЯ РСІ

РАГАЧОЎ. Двухдэкаднік трывогі не зрабіў аніякага пералому ў падрыхтоўцы да навучальнага году па Рагачоўскім раёне. Інспэктура, райвыканком і райком партыі па-ранейшаму бязьдзейнічаюць.

На 1930-31 год патрэбна было пабудаваць 14 новых школ, а будуюцца толькі 3. Борканівская школа Ціхініцкага сельсавету яшчэ з мінулага году забясьпечана неабходнымі будматар'яламі, але будаўніцтва яе далёка ня скончана. Патрэбна адрамантаваць 40 школ, з якіх рамантуюцца толькі 33, а рэшта і не распачыналася.

Яшчэ горшая справа з абсталяваньнем школ. Патрэбна звыш 600 школьных лавак, 40 шаф і 32 дошак. Аднак, нічога ня робіцца за выключэньнем шаф. Дырэктар заводу тав. Альтшулер затрымлівае водпуск матар'ялаў, кажучы: «Мне патрэбна выконваць экспартныя заказы».

Улік няпісьменных, якія падлягаюць абавязковаму навучаньню, праведзен няпоўнасьцю. З 8 школ зусім няма вестак. Райком камсамолу толькі пастанаўляе, а практычна нічога ня робіць у галіне падрыхтоўкі да новага навучальнага году. Мы патрабуем умяшаньня органаў КК-РСІ.

У ДУБРОЎНЕ ПАДРЫХТОЎКУ ПРАСПАЛІ

ДУБРОЎНА, 24. (Белта). Падрыхтоўка да новага навучальнага году па Дубровенскім раёне праспана. Школы не забясьпечаны адпаведнымі памяшканьнямі. Рабфак ня мае памяшканьня для заняткаў. Райвыканком замест прадастаўленьня памяшканьня прапануе перайсьці на трохдзённую вучобу.

Зусім дрэнна праходзіць камплектаваньне рабфаку. На ляўрэйскі сэктар, дзе маркуецца прыняць 25 чалавек, да гэтага часу не паступіла ніводнай заявы. Такое становішча тлумачыцца тым, што партыйныя, камсамольскія ячэйкі і ў прыватнасьці парткалектыў фабрыкі «Дняпроўская мануфактура» да гэтага часу нічога не зрабілі ў справе вярбоўкі рабочых, калгасьнікаў яўрэяў на рабфак.

Падрыхтоўка да правядзеньня курсаў для ліквідатараў няпісьменнасьці праходзіць таксама марудна. Палітінспэктар тав. Прудзікаў нават ня ведае колькі ёсьць па раёне няпісьменных і малапісьменных.

Да гэтага часу ня складзена раённая сетка ліквпунктаў. Ёсьць пагроза зрыву пляну ліквідацыі няпісьменнасьці.

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

Аб ходзе друкаваньня падручнікаў і палітпадручнікаў на 20 жніўня 1931 году

У ЯКІМ СТАНІ	Заказы БДВ: Падручнікі	Заказы БДВ: п. падручнікі	Заказы цэнтр. выдавецтву: Падручнікі	Заказы цэнтр. выдавецтву: п. падручнікі	УСЯГО
Не набіраюцца	16	—	1	—	17
Набраны і затрыманы Галоўлітам	1 аўтарам у карэктуры				1
	2	—	—	—	2
Набраны і набіраюцца	8	5	7	3	23
Гатовы да друку і друкуюцца	9	1	3	1	14
Ня друкуюцца з-за адсутнасьці паперы	11	—	—	—	11
Пераплятаюцца	51	6	15	4	76
УСЯГО:	51	6	15	4	76
Зданы на базу з 15 па 20 жніўня г. г.	1	2	1	—	4
Паступілі рукапісі ў друк з 15 па 20 жніўня	2	—	1	—	3

УСЯГО 6,2 ПРОЦ. ПЛЯНУ

За жнівень і верасень месяцы Белкаапсаюз павінен быў адгрузіць для раёнаў і гарадоў БССР 98 тыс. пар вучнёўскага абутку. На 19 жніўня адгружана ў гарады 5.915 пар і ў раёны 1.400 пар, што складае 6,2 проц. пляну.

Абутак прызначаны для раёнаў, а абутковыя фабрыкі пасылаюць у іншыя гарады Савецкага Саюзу.

Загадчык школьным фондам Белкаапсаюзу—тав. Сулькіна глядзіць на справу скрозь пальцы. Яна дакладна ня ведае, якія фабрыкі і колькі ўжо адгрузілі абутку для раёнаў.

Мы патрабуем неадкладна зьнішчыць бюракратызм, і цягаціны. Плян завозу ў раёны школьнага абутку і вопраткі павінен быць у тэрмін і поўнасьцю выкананы.

Пост «Зьвязды»—Нарко.

РАМОНТ НЯ СКОНЧАН, МЭБЛІ НЕПАДРЫХТАВАНА

ГЛУСК, 24 жніўня. (БЕЛТА).

Будаўніцтва і рамонт школ па раёне ня скончаны. У новаадкрытых школах няма мэблі і падручнікаў. Нарэшце рэальная пагроза зрыву заняткаў. Нікога ў раёне гэта ня турбуе.

Закон аб увядзеньні ўсеагульнага навучаньня дзяцей, пастанова аб палітэканомічнай [illegible] не папулярызаваны ся-

Вучні рамантуюць вясковую школу.

Аб выкананьні пастаноў СНК БССР на конт перарэгістрацыі гарадзкога насельніцтва БССР, у сувязі з выдачай адзінай наборнай кніжкі

Пастанова камісіі выкананьня пры СНК БССР

Выслухаўшы даклад Нам. Старшыні Дзяржпляну БССР тав. Пятровіча аб перарэгістрацыі гарадзкога насельніцтва БССР у сувязі з выдачай адзінай наборнай кніжкі, камісія выкананьня пры СНК БССР устанаўляе:

Што ня гледзячы на пастановы СНК БССР за 3 кавіка 1931 г. «Пра перарэгістрацыю гарадзкога насельніцтва ў сувязі з выдачаю адзінай наборнай кніжкі» (З. З. БССР, 1931 г., № 11, паст. 89) і за 3 мая 1931 г. «Пра ход перапісу гарадзкога насельніцтва», паводле якіх раённыя выканаўчыя камітэтам і гарадзкім саветам было даручана дапамагчы пасьпяховаму правядзеньню перарэгістрацыі гарадзкога насельніцтва і ліквідаваць недахопы, якія ўзьнікаюць у справе правядзеньня перарэгістрацыі, да гэтага часу па частцы раённай перапісі ня скончан і матар'ялы не паданы ў Дзяржплян, прычым асабліва нядбайна адносіліся да правядзеньня перапісу гарадзкога насельніцтва ВІЦЕБСКІ ГАРАДСКІ САВЕТ, СЛУЦКІ, ЖЛОБІНСКІ І РАГАЧОЎСКІ РАЁНЫЯ ВЫКАНАЎЧЫЯ КАМІТЭТЫ.

Прымаючы гэта пад увагу, Камісія Выкананьня пры СНК БССР пастанаўляе:

Абавязаць старшынь ПЯТРЫКОЎСКАГА (па Пятрыкову, Капцэвічах і Пасталах), РАГАЧОЎСКАГА, ТАЛАЧЫНСКАГА (па м. Кохановае), ЧЫРВОНАПОЛЬСКАГА, ЛАГОЙСКАГА, ДУБРОВЕНСКАГА (па б. Лядзянскім раёне), АСЬВЕЙСКАГА, ПЛЕШЧАНІЦКАГА, ПРАПОЙСКАГА, АРШАНСКАГА, ПОЛАЦКАГА (па п. «Труды» і АСІПАВІЦКАГА (па м. Градзянка) раённых выканаўчых камітэтаў не пазьней як праз дэкаду скончыць усю работу па перапісе гарадзкога насельніцтва і даслаць матар'ялы перапісу ў Дзяржплян БССР.

2. За нядбайныя адносіны да перарэгістрацыі гарадзкога насельніцтва і няпрыняцьце захадаў да скончаньня яе ў вызначаны тэрмін, АДВЯСЬЦІЦЬ ВЫМОВУ СТАРШЫНЯМ РАЁННЫХ ВЫКАНАЎЧЫХ КАМІТЭТАЎ: СЛУЦКАГА—ТАВ. ВІНАГРАДАВУ, ЖЛОБІНСКАГА—ТАВ. АНТОНАВУ, РАГАЧОЎСКАГА—ТАВ. МАЦЬКО І ЗКАНАМІСТАМПЛЯНАВІКАМ: Слуцкага РВК ДАРЭЎСКАМУ, Жлобінскага РВК—тав. САРОКА, Рагачоўскага РВК тав. ГРЫНШТЭЙНУ.

3. Прыняць да ведама, што Дзяржплянам пераданы пракуратуры для прыцягненьні вінаватых асоб да судовай адказнасьці справы аб страце матар'ялаў перапісу гарадзкога насельніцтва па гор. Віцебску.

Час. Вык. аб. Старшыні Камісіі Выкананьня пры СНК БССР ІВАНОЎ.

Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР Я. ЭЛЬКІН.

30 жніўня 1931 г.
г. Менск.

ЗМАГАЙЦЕСЯ ЗА РЭКОРДНЫЯ ТЭМПЫ

за поўнае выкананьне пляну асеньня-зімовых перавозак, ЗА ПЯРШЫНСТВА НА ЎСЕСАЮЗНЫМ КОНКУРСЕ НА ЛЕПШУЮ ПАРАВОЗНУЮ БРЫГАДУ“

АДОЗВА ПРЭЗЫДЫУМУ ЦСПСБ І ДРУГОГА ПЛЕНУМУ БЕЛБЮРО ЦК ЧЫГУНАЧНІКАЎ

Да ўсіх рабочых, служачых, інжынэрна-тэхнічнага і гаспадарчага пэрсаналу чыгуначнікаў БССР

ТАВАРЫШЫ ЧЫГУНАЧНІКІ!

Вялізарныя задачы, пастаўленыя партыяй перад рабочай клясай у справе рэканструкцыі і аздараўленьня чыгуначнага транспарту, у справе выкананьня трансфінпляну ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі ўскапыхнулі самыя шырокія масы рабочае клясы, у тым ліку чыгуначнікаў. Разгорнуты на аснове пастановы чэрвеньскага пленуму ЦК УсКП(б)Б, адозвы ЎсеЦСПС, ЦК чыгуначнікаў і НКШЗ усесаюзны конкурс на лепшае дэпо, станцыю, дыстанцыю, экіпадаж, на лепшую паказальную работу паасобных адзінак транспарту, усё больш узьнімае энтузіязм рабочых-чыгуначнікаў, які выяўляецца ў лепшых паказальніках работы у штодзённым разгортваньні гераічных прыкладаў сацыялістычнай працы.

У Гомельскім раёне арганізавана 26 ударных паказальных брыгад па зьмене шпал, якія замест заданьня — 14 даюць 32 шпалы на чалавека.

Ударны цягнік С—312, які абслугоўваецца машыністамі ДЗЕНІСАВЫМ І ШУЛЬГАЙ, за час з дня абвяшчэньня конкурсу дабіліся наступных вынікаў: НІВОДНАГА СПАЗЬНЕНЬНЯ З ЦЯГНІКАМІ, НІВОДНАГА ЗДАРЭНЬНЯ ЗРЫВУ СПАРАНАЙ ЯЗДЫ, САМІ ВЫКОНВАЮЦЬ РАМОНТ ЦЯГНІКА АД ПРАМЫЎКІ ДА ПРАМЫЎКІ.

СТ. ВОРША ПА ВЫКАНАНЬНІ СВАІХ ВЫМЯРАЛЬНІКАЎ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЛЕПШАЙ ПА МБД І ЎВАХОДЗІЦЬ КАНДЫДАТАМ ВА ЎСЕСАЮЗНЫ КОНКУРС.

ВІЦЕБСКІ ВУЗЕЛ: цягнік С—74 на чале з машыністам тав. СЯМАК і тав. КАПІТОНАВЫМ маюць нагон у пуці, не зрабілі ніводнага спыненьня ў дарозе, ёсьць эканомія апалу, добрыя адносіны да перавозу барацьба за замацаваньне спаранай язды і г. д.

Па Жлобінскім раёне: паравоз сэрыі «Щ» на чале з машыністам тав. ТАМКОВЫМ і тав. БАЙКАЧОВЫМ у маі месяцы з'эканоміл апалу 15.022 кгр., у чэрвені—1.030 кгр., эканомія на рабочай сіле ў маі—63 р. 85 кап., у чэрвені—166 р. 89 кап., з'эканоміл змазачных, абдзірачных і асьвятляючых матар'ялаў за май-чэрвень—37 р. 09 кап.

Ударная брыгада пуцейскіх работ у складзе т. т. СКОРАБАГАТАГА, ЧОРНАГА, ЯЎЗОРАВА, ГАРЭЛІКА пад кіраўніцтвам старшага дарожнага майстра 29-ай дыстанцыі, і брыгада ст. Урэчча пад кіраўніцтвам дарожнага майстра т. СЯРГЕЕНКІ прыстасавалі вопыт тав. Кацуро на зьмене шпал і зараз мяняюць замест 14 шпал 31 шпалу на чалавека.

Гэтыя ўзоры сапраўднай ударнай работы штодзённа ўзрастаюць і ахопліваюць усё больш і больш рабочыя масы чыгуначнікаў.

Але гэтыя посьпехі далёка невыстарчальны для выкананьня задач, пастаўленых перад чыгуначным транспартам. Яшчэ ня ўсе рабочыя ахоплены ўдарніцтвам і сацспаборніцтвам, кепска пастаўлен улік і кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, ва многіх мясцох ёсьць выпадкі злоснага парушэньня працоўнай дысцыпліны, прагулаў, п'янства, спазьненьня на работу і г. д., напрыклад:

Па ГОМЕЛЬСКІМ дэпо за першую пяцідзённку жніўня з-за няяўкі на работу машыністаў т. т. НОВІКАВА, АСІПЕНКІ І ГІШКОВА стварыўся зрыў спаранай язды.

Па ВІЦЕБСКІМ вузле: машыністы т. т. ВОЙЦІК і ХРЫЛОВІЧ п'янствуюць, не зьяўляюцца на работу, чым тармозяць работу транспарту.

Па ЖЛОБІНСКІМ раёне на ст. Асіпавічы сьлясарная брыгада ў складзе т. т. ЭЛЬКІНА, ШАХЛОВІЧА, ДУДАРАВА, КАВАЛЮК І МАКСІМАВА не зьявілася на работу і прагуляла 4 гадзіны, чым грубо парушыла працэдысцыпліну.

Рабочы сход ст. Асіпавічы пастановіў —злосных парушыцеляў працэдысцыпліны прыцягнуць да адказнасьці, з перадачай справы ў таварыскі суд.

Усе перапічаныя недахопы гавораць аб непадрыхтаванасьці чыгуначнага транспарту да адной з галоўных і чарговых задач—да асеньня-зімовых перавозак, усе яны б'юць па якасьці рамонту, перашкаджаюць замацаваньню спаранай, пераходу на гаспадарчы разрахунак і ліквідацыі абязьлічкі.

Усё гэта патрабуе самай рашучай барацьбы і ўзмацненьня кіраўніцтва пановаму з боку прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый.

Прэзыдыум ЦСПСБ і другі пленум Белбюро ЦК чыгуначнікаў цалкам і поўнасьцю далучаецца да пастановы ЎсеЦСПС і ЦК чыгуначнікаў і заклікаюць усіх рабочых, служачых, інжынэрна-тэхнічны і гаспадарчы пэрсанал чыгуначнікаў Беларусі ўключыцца па-баявому ў абвешчаны ўсесаюзны конкурс па сацспаборніцтве паравозных брыгад на званьне лепшай брыгады і лепшага машыніста СССР па выкананьні вытворчых паказальнікаў.

ЦСПСБ і Белбюро ЦК чыгуначнікаў упэўнены, што маса чыгуначнікаў, бядучы штодзённа барацьбу за рэкордныя паказальнікі на транспарце, высуне са сваіх радоў дзесяткі лепшых сваіх паравозных брыгад і машыністаў, вартых свайго субрата, машыніста Курскай дарогі тав. ГАМАЮНАВА, у кандыдаты на ўсесаюзнае прэміраваньне.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі—за рэкордныя тэмпы на чыгуначным транспарце!

За 100-процантнае замацаваньне спаранай язды!

За кіраўніцтва па-новаму і сапраўдную перабудову прафработы!

За 100-процантнае выкананьне пляну асеньня-зімовых перавозак!

ПРЭЗЫДЫУМ ЦСПСБ І ДРУГІ ПЛЕНУМ БЕЛБЮРО ЦК ЧЫГУНАЧНІКАЎ.

Гомсельмаш абвясьціў паход за каапэрацыйны мінімум

Перад канфэрэнцыяй па якасьці хлеба

Барацьба за добраякасны хлеб— адказны вучастак рабочага забесьпячэньня

(На нарадзе пры „Зьвязьдзе")

Якасьць хлеба, які выпускаецца Менскім хлебазаводам, часта выклікае правільнае абурэньне спажыўца. Бываюць выпадкі, калі хлеб сыры, гарэлы, або ў ім знаходзяцца такія «неспажыўныя рочы» як цьвікі, вяроўкі, акуркі.

Хто-ж вінаваты ў выпуску нядобраякаснага хлеба? Гэтаму пытаньню і быў прысьвечана нарада, скліканая ЦП саюзу каапэрацыі і дзяржгандлю, гарпрафсаветам і рэдакцыяй «Зьвязды».

Работнікі хлебапячэньня прабавалі вэаліць віну за дрэнную, якасьць на муку, а мукамолы гаварылі, што пекары з добраякаснай мукі выпякаюць дрэнны хлеб.

З усіх спрэчак было ясна адно, што ніякіх аб'ектыўных прычын для апраўданьня агіднасьцяй з якасьцю хлеба. Работнікі хлебапячэньня і Саюзхлеба ня хочуць толькі зразумець, што яны абавязаны даць добраякасны хлеб і што дрэнны хлеб б'е па рэальнай зарплаце рабочага, паніжае прадукцыйнасьць працы і гэтым самым перашкаджае барацьбе за прамфінплян.

Выяўляюцца даволі цікавыя факты. Спажывец скарджэцца, што хлеб нядобраякасны, а хлебазавод даводзіць, што за другую дэкаду жніўня выпушчана 90,37 проц. стандартнага хлеба, а на вадзяленьні — 98,2 проц. Антымізм заводзкіх арганізацый ня ўвязваецца з сапраўднасьцю і толькі ўводзіць у зман пралетарскую грамадзкасьць і дэмабілізуе рабочы калектыў заводу на барацьбу за якасьць.

Справа ў тым, што бракераж дзяржаўнай хлебнай інспэкцыі, які склаў пакаранньня лічбы, пры цяперашніх яго мэтадах работы нікуды ня варты. На падставе аналізу адной партыі хлеба бракераж дае водгук аб усіх партыях за гэты дзень, што вяўляецца зусім няправільным. Так, былі выпадкі, калі хлеб выпускаўся з заводу, а потым бракаваўся ўжо ў краме. Хлебная інспэкцыя адарвана ад вытворчасьці. Існуючая сыстэма бракеражу хлеба фактычна зьнімае адказнасьць за якасьць як з хлебазаводу, так і з інспэкцыі.

На менскім хлебазаводзе рад непаладак, якія б'юць па якасьці. З умоў тав. Сталіна не знайшлі выстарчальнага адбіцьця ў рабоце трыкутніка. Абязьлічка, ураўніловка ў зарплаце займаюць на заводзе ганаровае месца. Завод пераведзен на гаспадарчы разрахунак толькі фармальна. Зьмены ня маюць пастаянных штатаў. Машыны абязьлічаны. Бытворчыя нарады не разгарнулі работы. За паўгода ня было ніводнай рабочай прапановы.

Некаторыя брыгады паказваюць сапраўдныя ўзоры барацьбы за якасныя паказальнікі прамфінпляну. Да іх належаць рабочыя брыгады Мароза — 100 процантнага стандартнага хлеба, Паркевіча і Петрашкевіча — 90,5 проц. стандарту. Але гэтыя брыгады, якія працуюць больш і лепш, атрымліваюць такую-ж зарплату, як і тыя брыгады, што даюць ганебныя паказальнікі.

Бяз сумненьня, што значная доля віны за недобраякасны хлеб ляжыць і на Саюзхлебе, які ня прымае рашучых мер, каб забясьпечыць завод вытрыманой мукой. Няма ўвязкі ў рабоце паміж Саюзхлебам і хлебазаводам. На працягу паўгода Саюзхлеб за парушэньне стандарту мукі павінен быў заплаціць хлебазаводу каля 300.000 руб. Саюзхлеб павінен паставіць перад сабой задачу — забясьпечыць хлебазавод ня менш як 10-дзённым запасам мукі. Хлебазавод павінен у тэрміновым парадку прыстасаваць для гэтай мукі адпаведныя памяшканьні. Завод, маючы звычайна ня больш 2-хдзённага запасу, вымушан пускаць у работу слаба прасушаную муку. Павінна быць устаноўлена правільная макіроўка мукі.

На якасьць хлеба мае ўплыў і яго транспартаваньне. Адміністрацыя хлебазаводу, экспэдытары ня выконваюць правіл транспартаваньня. Хлеб перавозіцца ў фургонах, зусім не прыстасаваных для гэтай мэты. Пры нагрузцы і выгрузцы возчык у брудных ботах лезе ў фургон і там укладвае хлеб. Апошні звычайна кідаецца кіпамі адзін на адзін. Баранкі перавозяцца ў брудных, пыльных мяхох ад мукі. Належная тара адсутнічае. Між тым, патрабуецца вельмі мала сроджаў, каб наладзіць перавозку хлеба ў скрынках, каб ён не псаваўся.

Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі хлебазаводу, Саюзхлеба, млыноў, каапэрацыйных арганізацый да гэтага часу не аддавалі належнай увагі барацьбе за якасьць.

ЦП саюзу рабочых мукамольнай і кандытэрскай прамысловасьці ў парадку барацьбы за ўдарны цэх узяло бараначны цэх хлебазаводу пад асобны нагляд. Для ненасрэднай работы ў ім прымацован член прэзыдыуму ЦП. Некаторыя брыгады пераводзяцца на гаспадарчы разрахунак. Уводзіцца прагрэсыўна - прэміяльная зьдзельшчына. Арганізуецца канвэер якасьці ад млына да хлебнай крамы. Вопыт бараначнага цэху будзе перанесен і на іншыя цэхі заводу.

Падыходзячая 29 жніўня агульна-гарадзкая канфэрэнцыя па якасьці хлеба павінна будзе намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па паляпшэньні якасьці хлеба

Ня трэба забываць, што барацьба за добраякасны хлеб — важны вучастак рабочага забесьпячэньня. Гэта барацьба павінна стаць справай усёй пралетарскай грамадзкасьці і ў першую чаргу работнікаў хлебапячэньня.

М. К.

З ЛІСТА РАБОЧЫХ ГОМСЕЛЬМАШУ ДА ЎСІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ГОМЕЛЮ І БССР

Для рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб грамадзкім харчаваньні, рабочыя Гомсельмашу абвясьцілі масавы паход за каапэрацыйны мінімум і зьвярнуліся праз газэту «Палеская праўда» з лістом да ўсіх прадпрыемстваў Гомелю і БССР.

Рабочыя Гомсельмашу абавязваюць ЗРК з 25 жніўня сыстэматычна забясьпечваць сталоўку прадуктамі ў адпаведнасьці з нормамі, у бліжэйшыя-ж дні дабіцца рэзкага пералому ў паляпшэньні якасьці абедаў, ачысьціць сталоўку ад бруду, мух і сьмецьця.

«Мы абавязваем ЗРК, — гаворыцца ў лісьце, — пакончыць з «стандартнымі» абедамі, пашырыць мэню, даўшы сталоўцы права самастойна купляць прадукты.

Мы арганізуем грамадзкую рабочую інспэкцыю для кантролю за работай сталоўкі і вылучаем у гэту інспэкцыю 10 рабочых-актывістаў і 15 жонак рабочых.

Вылучаем двух работнікаў плянавага аддзелу і бухгальтэрыі канторы Сельмашу, аднаго рабочага нармоўшчыка для дапамогі ў парадку грамадзкай нагрузкі рабкопу і загадчыку сталоўкі ў складаньні прамфінпляну сталоўкі, пераводзе яе на гаспадарчы разрахунак і самастойны баланс, а работнікаў сталоўкі на прагрэсыўную зьдзельшчыну

Для дапамогі ЗРК па наладжаньні грамадзкага харчаваньня і работы буфэту вылучаем 4 сацыялістычных сумяшчальнікаў: аднаго рабочага сацсумяшчальніка на пасаду старшыні сэкцыі грамадзкага харчаваньня ЗРК, аднаго — намесьніка загадчыка сталоўкі, аднаго — намесьніка загадчыка буфэту, аднаго — намесьніка загадчыка сталоўкі па плянава-рахункаводчай частцы.

Мы абавязваемся прыняць практычныя меры, каб на працягу трох месяцаў давесьці сьвіннааднорм пры сталоўцы з 20 сьвіней да 100, арганізаваць разьвядзеньне птушак, трусоў. Для гэтай мэты стараем спэцыяльную брыгаду.

Мы вылучаем спэцыяльную «сквозную» брыгаду з 5 рабочых для арганізацыі кантролю і аказаньня практычнай дапамогі райкалгассаюзу, ЦРК і ЗРК па забесьпячэньні рабочых Сельмашу гародніной, па падшуканьні на працягу 10 дзён дадатковых хавалень ня менш, як на 160 тон.

Бярэм шэфства над работай загатоўчых арганізацый Гомельскага раёну па загатоўцы малака і вылучаем пастаянную брыгаду з 5 чалавек, каб дабіцца рэзкага пералому ў ходзе загатовак малака і значнага пашырэньня вырабу малочных прадуктаў.

Абавязваем ЗРК адкрыць да 10 верасьня 4 новыя крамы: прамтаварную, мясную, для гародніны і прадуктова-гароднінную пры заводзе. Для дапамогі ЗРК у падшуканьні памяшканьня і іх абсталяваньня вылучаем брыгаду з 5 чалавек.

Для перабудовы работы крам па-новаму, капектыў Гомсельмашу вылучае двух рабочых і аднаго работніка канторы, якія ў парадку грамадзкай нагрузкі павінны дапамагчы ЗРК у пераводзе магазынаў на гаспадарчы разрахунак, а работнікаў прылаўку — на зьдзельшчыну. Апрача таго, вылучаем у праўленьне ЗРК двух сацыялістычных сумяшчальнікаў — аднаго на пасаду загадчыка арганізацыі, а другога — намесьніка загадчыка гандлёвага аддзелу».

Гомсельмашаўцы заклікаюць рабочых усіх прадпрыемстваў Гомелю і рабочых прамысловых цэнтраў БССР склаць па іх прыкладзе каапэрацыйны мінімум, які-б стаў канкрэтнай праграмай дзеяньня па паляпшэньні рабочага забесьпячэньня, па перабудове работы спажывецкай каапэрацыі па ўмовах кожнага прадпрыемства.

Распрацоўка каапэрацыйнага мінімуму на кожным прадпрыемстве — такая задача ўсіх ФЗМК, усіх партыйных і намсамопольскіх арганізацый.

«НІ АДНАГО ЦЭНТНЭРУ ЗБОЖЖА ПРЫВАТНІКУ»

У авангардзе—

Чырвона-Слабодзкі раён, які перавыканаў жнівеньскі плян па збожжы

РАУНЕНЬНЕ НА ПЕРАДАВІКОЎ—УДАР ПА САМАЦЁКУ, ПА АПАРТУНІСТЫЧНАЙ НЕДААЦЭНЦЫ АДНААСОБНІКА

Практыка першых дэкад загатоўчай кампаніі дазваляе зрабіць некаторыя вывады аб падрыхтаванасьці і рабоце загатоўчых арганізацый.

Пляны загатовак сена, збожжа, бульбы былі атрыманы раёнамі своячасова, але далёка ня ўсе раёны давялі пляны да сельсаветаў.

У Бярэзінскім, Брагінскім і Аршанскім раёнах пляны былі спушчаны ў сельсаветы толькі праз дэкаду пасьля іх атрыманьня. У Брагіне старшыня РВК тав. Шэстакоў атрыманыя з Менску пляны паклаў пад сукно. 12-га жніўня пытаньне аб загатоўках павінна было абгаварвацца на бюро райкому, але яго зьнялі з прычыны непадрыхтаванасьці. У Сіроцінскім і Бешанковіцкім раёнах пляны загатовак, за выключэньнем сена і саломы, ня былі своячасова распрацаваны і даведзены да сельсавету. У Бешанковічах наогул няма кіраўніцтва сеназагатоўкамі, якія праходзяць самацёкам бяз усякага ўліку.

Давядзеньне плянаў да сельсаветаў па Гарадоцкім раёне затрымалася з-за таго, што старшыня РВК, замест распрацоўкі плянаў, камандураваў раённага інспэктара забесьпячэньня ў Менск хадайнічаць, каб раён вызвалілі ад збожжазагатовак. Старшыня Гарадоцкага Райкаапсаюзу адмовіўся прыняць прывезеныя чырвоным абозам 10 вазоў сена, матывуючы гэта тым, што «мала прывезьлі».

Пытаньне аб бязтарных перавозках загатоўчымі арганізацыямі зусім не распрацавана. У Слуцку, з-за адсутнасьці тары, кантора Белсадгароднінны адмовілася прыняць ад калгасаў гуркі і яблыкі, і калгаснікі прымушаны былі везьці іх назад. Цэнтральныя загатоўчыя арганізацыі ня далі сваім нізавым органам катэгарычных дырэктыў аб правядзеньні бязтарных перавозак, аб скарыстаньні ўсіх мясцовых рэсурсаў (абор мяшкоў, рамонт старай тары, пляценьне кошыкаў і г. д.)

Абураючы факт меў месца ў Чырвона-Слабодзкім раёне. Загадчык мясцовага райбанку адмовіўся фінансаваць загатоўкі сена з прычыны... выкананьня райкаапсаюзам жнівеньскага пляну. Паводле думкі загадчыка банку, загатоўкі сена трэба было спыніць, бо «датэрміновае выкананьне пляну не абавязкова».

У Жыткавіцкім раёне, з-за адсутнасьці ўвагі з боку РК і РВК да работы райкаапсаюзу, які вядзьлецца асноўным загатоўшчыкам збожжа ў раёне, Райкаапсаюз у разгар загатовак апынуўся без старшыні, членаў праўленьня і рахункова апарату. Прэзыдыум Жыткавіцкага РВК парушыў пастанову СНК БССР ад 13-га ліпеня, усклаўшы збожжазагатоўкі на райспажыўсаюз, які да гэтага ня быў падрыхтаваны.

Гэты факт заслугоўвае асаблівай увагі, бо ў іншых раёнах наглядаюцца тэндэнцыі ліквідацыі Райкаапсаюзаў, не арганізаваўшы поўнага ахопу ўсіх таварных лішкаў с.-г. прадукцыі. «Тэорыя» аб тым, што ў раёне з усімі загатоўкамі справіцца толькі адна спажывецкая каапэрацыя зьяўляецца шкоднай і вядзе да зрыву загатовак.

Нельга займацца арганізацыйнай ломкай загатоўчага апарату ў момант, калі мы ўступілі ў паласу непасрэднага правядзеньня загатовак. Трэба ўмацоўваць загатоўчы апарат адпаведнымі кадрамі, якія-б забясьпечылі посьпех кампаніі. Жыткавіцкія кіруючыя арганізацыі павінны зараз-жа выправіць сваю памылку ў адносінах райкаапсаюзу, накіраваўшы туды на адказную работу здольных таварышоў, якія-б маглі ліквідаваць дапушчаныя прарывы. Трэба дапамагчы Жыткавічам арганізаваць тэхнічны апарат загатовак. Неабходна памятаць, што правільна арганізаваны загатоўчы апарат у значнай ступені забясьпечвае выкананьне і перавыкананьне загатоўчых пляноў.

На даным этапе загатовак с.-г. каапэрацыя адыгрывае значную ролю і недаацэнка яе, імкненьні да ліквідацыі райкаапсаюзаў прыносяць вялікую шкоду загатоўчай кампаніі. Праз с.-г. каапэрацыю ў адпаведных ей раёнах павінна прайсьці галоўная маса збожжа, ільну, пянькі, мяса, бульбы і гародніны. Гэта абавязвае ўсе раённыя арганізацыі наладзіць работу апарату райкаапсаюзаў. Інстытут сельупаўнаважаных, які павінен зьявіцца нізавым загатоўчым апаратам с.-г. каапэрацыі, арганізаваны далёка ня ўсюды. З упаўнаважанымі не праведзены курсы-нарады па пытаньні загатовак.

Трэба стварыць інстытут сельупаўнаважаных ва ўсіх раёнах і прыступіць да практычнай работы па ажыцьцяўленьні пляну, спагнаньне прадукцыі па кантрактацыйных дагаворах і своячасовай вывазкі загатоўленых прадуктаў.

Ня лепш стаіць справа з арганізацыяй загатоўчага апарату спажывецкай каапэрацыі. Дагэтуль загатоўчыя канторы спажыўкаапэрацыі арганізаваны далёка не ва ўсіх раёнах—іх няма ў Жыткавічах, Пятрыкове, Сеньне, Вягомлі і г. д. Аршанская кантора да практычнай работы не прыступіла. Белкаапсаюз павінен у тэрміновым парадку скончыць арганізацыю загатоўчых кантор, якім трэба неадкладна прыступіць да практычнага правядзеньня загатовак.

Асноўную арганізуючую ролю ў раёне павінны адыграць райснабы. Між тым справа з кадрамі райснабаў стаіць зусім дрэнна. Ёсьць пімат раёнаў (Брагін, Дубровна, Хойнікі і інш.) дзе райснабаў зусім няма, або яны працуюць па сумяшчальнасьці.

У Плешчаніцах абавязкі Райснаба выконвае сакратар РВК, у Жыткавічах — старшыня райкаапсаюзу, у Крычаве—старшыня РВК. У мэтах пасьпяховага выкананьня загатоўчых пляноў, кожны раён павінен мець спэцыяльнага, разгружанага ад іншых работ, райснаба, які-б добра ведаў мэтады і арганізацыю загатоўчай работы.

Трэба адзначыць, што ў асабістым складзе загатоўчых апаратаў захаваліся чужыя асобы, якія ня здольны і ня хочуць весьці загатоўчай работы, у адпаведнасьці з дырэктывамі партыі і ўраду. Трэба правесьці праверку і ачыстку загатоўчага апарату ад чужых элемэнтаў, рашуча высоўваць на іх месца калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў, якія праявілі сябе ў загатоўках, як добрыя арганізатары.

Агульныя вынікі першых дэкад загатовак сьведчаць аб нездавальняючым разгортваньні кампаніі. Так на сене года ны плян выканан толькі на 17,9 проц. Жнівеньскі плян збожжазагатовак выкананы толькі на 13 проц.

Неабходна зараз-жа на-ходу перабудаваць работу, неадкладна ўзяць бальшавіцкія тэмпы. Усім раёнам трэба раўняцца па Чырвона-Слабодзкім, які выканаў гадавы плян здачы сена на 104 проц., а па збожжы—на 10 жніўня чырвоным абозамі здана 169 тон, або 140 проц. жнівеньскага пляну.

Дрэнна абстаіць справа з афармленьнем кантрактацыйных кніжак. У большасьці раёнаў ня зроблена адзнак у кніжках кантрактантаў аб колькасьці прадукцыі, якая павінна быць здана дзяржаве. Наогул амаль нічога ня робіцца па арганізацыі здачы закантрактаванай прадукцыі, некаторыя раёны нават забыліся, што вясной праводзілі кампанію па кантрактацыі пасеваў. Неабходна запоўніць гэты прабел, аформіць усе кантрактацыйныя дагаворы і арганізаваць датэрміновую здачу закантрактаванай прадукцыі.

Не ва ўсіх раёнах даны цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам. Адны раёны спасылаюцца на адсутнасьць «належных установак», а другія кажуць, што ў іх «кулакоў і заможнікаў няма». Гэтым апартуністычным «спасыланьнем» трэба даць рашучы адпор. Трэба безадкладна вывяць усе кулацка-заможныя гаспадаркі і даць ім цьвёрдыя заданьні па здачы прадукцыі (збожжа, сена, бульбы і інш.) не пазней тэрміну, якія вызначаны СНК БССР. Адначасова неабходна весьці рашучую барацьбу з перагібамі і ўскімі спробамі пашырыць цьвёрдыя заданьні і на серадняцкія гаспадаркі.

Пачатак загатоўчай кампаніі паказвае, што клясава-варожыя элементы вядуць шалёную агітацыю за зрыў загатовак, Кулацкай агітацыі неабходна супрацьставіць мабілізацыю калгаснікаў і бяднацка-серадняцкіх пластоў вёскі вакол загатовак шляхам правядзеньня масавай растлумачальнай работы і арганізацыі чырвоных абозаў.

А. Красоўскі.

Пераможцы на загатоўчым фронце

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). ДЗЯКУЮЧЫ ШЫРОКАМУ РАЗГОРТВАНЬНЮ САЦСПАБОРНІЦТВА КАЛГАСАЎ І АДНААСОБНЫХ ГАСПАДАРАК, ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ГАДАВЫ ПЛЯН ЗДАЧЫ СЕНА НА 104 ПРОЦ.; ДА 10-га ЖНІЎНЯ ЧЫРВОНЫМІ АБОЗАМІ ЗДАНА 169 ТОН ЗБОЖЖА, ШТО СКЛАДАЕ 140 ПРОЦ. ЖНІВЕНЬСКАГА ПЛЯНУ. ТАКІМ ЧЫНАМ ЧЫРВОНА - СЛАБОДЗКІ РАЁН ІДЗЕ НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ Ў БССР ПА ЗДАЧЫ ЗБОЖЖА.

Апал—прамысловасьці і рабочым цэнтрам

ЧЫГУНКА АБАВЯЗАНА

забясьпечыць бесьперабойную дастаўку дроў

Выкананьне пляну дровазагатовак па БССР (у проц.)

3-я дэкада ліпеня	1-я дэкада жніўня	2-я дэкада жніўня
27,6	28,1	31,4

Кампанія дровазагатовак у БССР праходзіць недапушчальна марудным тэмпамі.

Не гледзячы на рашучую дырэктыву ЦКК і НК РСІ БССР аб забесьпячэньні 100 проц. выкананьня вызначаных урадам плянаў дровазагатовак, большасьцю песапрамгасаў, а таксама раённыя і нізавыя партыйныя і савецкія арганізацыі па-апартуністычнаму недаацэньваюць гэтай важнейшай баявой работы, чым зрываюць пляны дровазагатовак.

Гадавы плян дровазагатовак выканан на 25 жніўня прыблізна на 29 проц.

Работнікі Лесбелу, ня прымаюць ніякіх захадаў да таго, каб безадкладна перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з новымі задачамі і зрабіць жнівень і верасень месяцы сапраўды ўдарнымі месяцамі дровазагатовак і вывазкі.

Асабліва пагражаючае становішча мы маем у забесьпячэньні дрывамі Менску. Прызыдыум Менгарсавету, абгаворваючы ход забесьпячэньня гораду дрывамі, адзначыў, што толькі з-за нядбайных адносін загатоўчых арганізацый і чыгункі спраба забесьпячэньня працоўнага на сельніцтва Менску дрывамі пастаўлена пад пагрозу.

За ліпень і першую палову жніўня ў Менск дастаўлены 353 вагоны дроў, што складае ўсяго 11,9 проц. квартальнага пляну.

Лесбелу дана жорсткая дырэктыва аб поўным забесьпячэньні Менску дрывамі. Да асноўных 5 песпрамгасаў, якія прымацаваны да Менску, Лесбел выпучыў яшчэ РЭЧЫЦКІ, ПЯТРЫКОЎСКІ, ТУРАЎСКІ І ПАСТАЛОЎСКІ ПЕСПРАМГАСЫ, абавязаўшы апошнія ўдарнымі тэмпамі фарсаваць адгрузку дроў у Менск.

Зараз у 9 песпрамгасах, прымацаваных да Менску, ляжаць і чакаюць адпраўкі 2.600 вагонаў дроў.

Дзе прычына таго, што дровы ляжаць на песараспрацоўчых вучастках, а не дастаўляюцца ў Менск? Адказ просты: чыгунка не дае вагонаў.

Кіраўніцтва чыгункай па-ранейшаму, жадае яно гэтага ці не, зрывае дастаўку дроў у прамысловыя цэнтры.

Толькі гэтай прычынай тлумачыцца той ганебны факт, што за 5 дзён жніўня з 19 па 24 у Менск паступіла замест 500 вагонаў дроў толькі... 53.

Зараз патрэбна кінуць усе сілы на тое, каб дабіцца поўнай ліквідацыі прарыву ў дровазагатоўках, для чаго ў першую чаргу неабходна па-баявому ўзяцца за рэалізацыю апошняй пастановы ЦКК і НК РСІ БССР аб дровазагатоўках.

Толькі ажыцьцяўленьне ў найкарацейшы тэрмін гэтай пастановы забясьпечыць поўнае выкананьне ўрадавых пляноў дровазагатовак.

Раённы друк у пытаньнях пасьпяховага году дровазагатовак павінен адыграць важнейшую ролю.

Абавязак кожнай райгазэты на працягу бліжэйшых дзён безадкладна ўключыцца ў правядзеньне кампаніі дровапесазагатовак, увесьці ў сыстэму штодзённае зьмяшчэньне апэрацыйных зводак аб ходзе дровазагатовак.

ДА 1 ВЕРАСЬНЯ ПРАВЕСЬЦІ САМААБКЛАДАНЬНЕ

12, 000.000 р. —НА КУЛЬТУРНА-БЫТАВЫЯ ПАТРЭБЫ ВЁСКІ

Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі, аб'яднаньне раздробленых аднаасобных гаспадарак у калгасы патрабуюць далейшага шырокага паляпшэньня культурна-бытавых умоў вёскі. Вёсцы патрэбны новыя школы, бальніцы, мэдпункты, дзіцячыя яслі і кансультацыі. Сетка гэтых культурна-бытавых устаноў расьце з кожным годам. Яслі і кансультацыі, аб якіх сялянства да рэвалюцыі зусім ня ведала, усё больш і больш пашыраюцца ў сельскіх мясцовасьцях. Праводзіцца ўсеагульнае абавязковае навучаньне і г. д.

Па даяржаўным і мясцовым бюджэтах на культурныя патрэбы вёскі ў бягучым годзе адпушчана больш 100 млн. руб. Аднак рост патрэб шырокіх калгасных і бяднацка-серадняцкіх мас вёскі на глебе калектывізацыі абгоняе рост сеткі культурна-бытавых устаноў. Сродкаў бюджэту не хапае.

Выданы нядаўна Саюзным Урадам закон аб самаабкладаньні, які мае на мэце прыцягнуць насельніцтва вёскі да добраахвотнага ўдзелу ў фінансаваньні культурна - гаспадарчага будаўніцтва, шляхам правядзеньня самаабкладаньня, ідзе насустрэч запатрабаваньням шырокіх мас калгаснага і бяднацка-серадняцкага сялянства.

Закон мае вялікае палітычна-гаспадарчае значэньне.

У самаабкладаньні прымаюць удзел аднаасобнікі і калгаснікі, якія маюць неаграмаджаныя прыбыткі. Удзел у самаабкладаньні павінны прымаць і асобы, што жывуць у сельскіх мясцовасьцях, калі яны і ня маюць сельскай гаспадаркі.

Клясавы характар самаабкладаньня ярка паказан у законе. У той час, калі сераднякі-аднаасобнікі могуць прымаць самаабкладаньне ад 50 да 100 проц., **кулацкія гаспадаркі плоцяць абавязкова 100 проц. с.-г. падатку.**

Калгаснікі, якія маюць неаграмаджаныя прыбыткі, будуць плаціць ад 6 да 12 руб. Калгаснікі, якія ня плоцяць с.-г. падатак, будуць плаціць ад 4 да 8 руб.

Аднаасобныя маламоцныя гаспадаркі ўносяць 6-10 руб.

Сельскія саветы могуць поўнасьцю, або часткова вызваляць ад узносаў па самаабкладаньні калгаснікаў і маламоцныя аднаасобныя гаспадаркі.

Прымаць самаабкладаньне на адміністрацыйныя выдаткі забараняецца. Грошы павінны выдаткоўвацца на гаспадарчыя і культурныя патрэбы, якія вызначаны ў пастанове СНК ад 1-га жніўня г-г.

Да 1-га верасьня трэба правесьці агульныя сходы насельніцтва па пытаньні аб самаабкладаньні і перадачу акладных лістоў. Пры ударнай рабоце сельскіх саветаў і фінапарату зрабіць гэта зусім магчыма.

Плян мабілізацыі сродкаў у 4-м квартале ўключае таксама і пастуленьні ад самаабкладаньня. Таму неабходна імкнуцца, каб ня менш 40 проц. прынятых сходам сум паступіла ў верасьні; астатнія 60 проц. павінны паступіць не пазней першай дэкады лістапада.

Рэкамандуючы сходам устанаўляць ня больш двух тэрмінаў уплаты самаабкладаньня, райвыканкомы, фінапарат і сельсаветы павінны весьці агітацыйна-растлумачальную кампанію за датэрміновую здачу грошай. Прыклад павінны паказаць калгаснікі. Сумы з іх спагняюцца назначныя і яны могуць у добраахвотным парадку ўнесьці грошы, не чакаючы тэрміну.

Кулакі, згодна закону, уносяць самаабкладаньне ў 7-мідзённы тэрмін.

Самаабкладаньне праводзіцца ў добраахвотным парадку.

Але гэта зусім ня значыць, што сельсаветы і фінапарат павінны спадзявацца на самацёк.

Самацёк—не бальшавіцкі мэтад работы.

Сельсаветы павінны арганізавана і плянава правесьці самаабкладаньне.

Сельпартячэйкам і сельскаму актыву трэба па-ўдарному ўключыцца ў гэту кампанію. Прыклады мінулых год паказваюць, што насельніцтва больш за ўсё прызнавае самаабкладаньне на школьныя патрэбы. Таму настаўніцтва павінна актыўна дапамагчы сельсаветам у рабоце па самаабкладаньні.

Спробы кулацкіх элементаў вёскі зрываць або перашкаджаць самаабкладаньню павінны сустрэць самы рашучы адпор.

Вялікая роля ў правядзеньні кампаніі прыпадае на наш друк. Падняць кампанію на належную вышыню, забясьпечыць удзел у рабоце па самаабкладаньні калгаснікаў і сельскай грамадзкасьці—задачы цэнтральных і раённых газэт.

Самаабкладаньне дасьць, прыкладна 12 млн. руб. на культурнае і гаспадарчае будаўніцтва вёскі.

Разгорнутая масавая работа павінна забясьпечыць збор гэтых сродкаў.

АЙЗІНСОН.

На рыштаваньнях ільназаводаў

Чавускі ільназавод пусьціць да 1 кастрычніка

ЧАВУСЫ

Паводле дырэктывы ўраду чавускі ільназавод павінен быць пушчаны 1 кастрычніка. Аднак, тэмп будаўніцтва выклікае сур'ёзную трывогу. Па вытворчым корпусе плян выканан на 50 проц., па рашце будынкаў—на 70 проц.

Не хапае песаматар'ялаў, цьвікоў, жалеза.

Некаторыя раённыя арганізацыі не аказваюць дапамогі. Так, песапрамгас адправіў на ільназавод нядобраякасныя песаматар'ялы, якія ня могуць быць выкарыстаны і цяпер гніюць. Нарада старшынь калгасаў абавязала калгасы даць 50 фурманак тэрмінам на 5 дзён для вывазкі лесаматар'ялаў на будаўніцтва ільназаводу. Аднак, толькі адзін калгас выканаў гэту пастанову і даў 6 фурманак.

На будаўніцтве не вядзецца падрыхтоўка да мантажу. Адсутнічаюць пляны на патрэбную рабсілу. Да гэтага часу не атрыманы машыны.

У бягучым годзе па Чавускім раёне засеяна пад лён 1.629 гэкт. Трэба самым рашучым чынам ударыць па недаацэнцы своячасовага пуску ільназаводу з боку некаторых раённых арганізацый і ў прыватнасьці райкалгассаюзу.

ЛЯПІЧ

Замест справы, займаецца ашуканствам

ЛЕПЕЛЬ. (НАШ СПЭЦКАР.).

КІРАЎНІК НАВУДОВЫ ЛЕПЕЛЬСКАГА ІЛЬНАЗАВОДУ ВЕРЖБАЛОВІЧ ЗАПЭЎНІВАЕ РАЁННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ Ў ТЫМ, ШТО ЗАВОД У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ БУДЗЕ СКОНЧАН. МІЖ ТЫМ, НА 20 ЖНІЎНЯ ПЛЯН БУДАЎНІЦТВА ВЫКАНАН УСЯГО НА 50 ПРОЦ. УСЕ МАГЧЫМАСЬЦІ ДЛЯ СВАЯЧАСОВАГА ПУСКУ ЗАВОДУ ВЁСЬЦЬ. БУДАЎНІЦТВА ЗАБЯСПЕЧАНА РАБСІЛАЙ І МАТАР'ЯЛАМІ.

ТРЭБА ТОЛЬКІ, КАБ ВЕРЖБАЛОВІЧ, ЗАМЕСТ НАДЗЕІ НА САМАЦЁК, ПРАЯВІЎ БОЛЬШ ПАВАРОТЛІВАСЬЦІ І ГІБКАСЬЦІ Ў ПРАВЯДЗЕНЬНІ БУДАЎНІЧЫХ РАБОТ. ТРЭБА ЗЬНІЧЫЦЬ ТАКІЯ ВЫПАДКІ, КАЛІ ПАСЫЛАЮЦЬ ФУРМАНКІ ЗА МАТАР'ЯЛАМІ, А ВЫДАВАЦЬ ГЭТЫЯ МАТАР'ЯЛЫ НЯМА КАМУ.

СТАРЭЙШЫ ДЗЕСЯТНІК КАЗЛОЎ, СТУДЭНТ ВНУ, НЕ ДАПАМАГАЕ РАБОЧАМУ КАЛЕКТЫВУ ЗМАГАЦЦА З ПЯЖЖАСЬЦЯМІ І ЧАСТА САМ ПЕРАДЫМІ ПАСУЕ. КАЛІ РАБОЧЫЯ ПРАЦА НАВАЛІ НАКРЫВАЦЬ ДАХ БЯЗ ЦЬВІКОЎ, КАЗЛОЎ АБАЗВАЎ ГЭТЫХ РАБОЧЫХ «ДУРНЯМІ»

А. М.

ПЛЯН ВЫКАНАН НА 63 ПРОЦ.

УВАРАВІЧЫ. Тэмпы будаўніцтва Уваравіцкага ільназаводу недастатковыя. Плян выканан на 63 проц.

Калгасы «Чырвоны шлях» і імя Будзённага, як і раней, не аказваюць будаўніцтву належнай дапамогі рабочай і цягавай сілай. Толькі адзін Гуславіцкі сельсавет паказвае прыклад дапамогі ільназаводу ў вывазцы лясных і будаўнічых матар'ялаў.

Адчуваецца недахват толі, цэглы, што затрымлівае ход работы. РВК, райкалгассаюз, райсаюз павінны аддаць больш увагі новаму ільназаводу, каб забясьпечыць яго своячасовы пуск.

А. Казіміраў.

„Палепшыць бытавыя ўмовы рабочых—такава задача" (І. Сталін)

Рэалізуем прапановы ЎДАРНІКАЎ ДРУКУ

Рэйд брыгад «Праўды» і «Зьвязды» па прадпрыемствах, сталоўках і ЖАК'тах Менску выявіў парушэньне элемэнтарных санітарна-гігіенічных запатрабаваньняў.

З мэтай падагуленьня матар'ялаў рэйду і рэалізацыі прапаноў брыгад, рэдакцыя «Зьвязды» і паўпрэдзтва «Праўды» склікалі нараду з удзелам прадстаўнікоў Наркамату аховы здароўя, гаркому КП(б)Б, ЦСПСБ, пракуратуры, санінспэкцыі і інш.

У сваёй інфармацыі Нарком аховы здароўя тав. ЦЭНЦЫПЭР адзначыў, што пастанова СНК ад 23-га чэрвеня аб паляпшэньні санітарнага становішча гарадоў дагэтуль ня выканана многімі арганізацыямі. Акты санітарнай інспэкцыі вестаюцца бяз вынікаў, штрафы міліцыяй не спагняюцца. Жыллаапрацыя ня ўключылася ў паход за санмінімум, ня прымае мер да зьнішчэньня тых агіднасьцяй, якія назіраюцца у ЖАК'тах.

Органы юстыцыі таксама недаацэньваюць паходу за санмінімум, не прыцягваюць да адказнасьці вінаватых, не праводзяць у паказальным парадку суды над парушыцелямі правіл і санітарнай гігіены. Трэба стварыць карэнны зрух, дабіцца неадкладнага павароту ўсіх устаноў і арганізацый, усёй грамадзкасьці тварам да паляпшэньня санітарнага становішча гораду.

Прадстаўнік пракуратуры рэспублікі тав. КІСЕЛЬГОФ інфармаваў, што санінспэкцыя ня ведае, як сьпед, сваіх абавязкаў, не вядзе дэтальнага расьледваньня выпадкаў парушэньня правіл санітарыі і гігіены. Паводле думкі пракуратуры, трэба пашырыць правы санінспэкцыі і ўскласьці на яе ня толькі складаньне актаў, але і рэалізацыю апошніх (накладаньне штрафаў і інш.).

**Прадстаўнік гарпракуратуры паведаміў, што старшыні ЖАК'аў і загадчыкі дамоў, якія персанальна аштрафаваны за антысанітарыю, плоцяць штрафы не са сваіх сродкаў, а... за кошт ЖАК'у. Гэтыя асобы будуць прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці за растрату дзяржаўных сродкаў

СТОГНЫ І ЕНКІ КАТАВАНЫХ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ НЯСУЦЦА З УСІХ ПОЛЬСКІХ ТУРМАУ

Пралетары ўсяго сьвету,

10.000 рэваліоцыянэраў клічуць вас на дапамогу

Год выданьня—XV
№ 231 (4136)
СЕРАДА 26 ЖНІЎНЯ 1931
Цана нумара 5 кап.
выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І МАЙСТРЫ
МЕНСК, СЛАВЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—6-27, сакратар—10-74, партсэк тар—13-60, прамысл.—13-80, сан. бюро 6-19, мясц. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—6-19, пашп. бюро—6-42, міжгародняя інфармацыя—10-74, нашпорма-ка—81, кнігасбыт—7-7.

„МЫ ЗАКЛІКАЕМ ВАС, РАБОЧЫЯ АНГЛІІ,

СТАЦЬ МАГУТНАЙ СЬЦЯНОЙ У АБАРОНУ НАШЫХ БРАТОУ ПА КЛЯСЕ“

Ліст рабочых фабрыкі „Везувій“

Дарагія таварышы!

У той час, калі капіталістычны сьвет усё больш пагружаецца ў бяздоньне крызісу, калі армія беспрацоўных бязупынна расьце — Савецкі Саюз разьвіваецца бурнымі тэмпамі. Сацыялістычная сыстэма ўжо паказала свае перавагі перад капіталістычнай. Гаспадарамі нашай краіны зьдзяйнецца рабочая кляса. У СССР няма ні аднаго беспрацоўнага.

Мы сыстэматычна паляпшаем матар'яльнае і культурнае становішча рабочых і працоўных мас сялянства. Замест нацыянальнага прыгнечаньня — гэтай асновы капіталістычнай улады — мы маем умацаваньне брацтва народаў СССР, вельмі шыркі ўздым гаспадаркі і сацыялістычнай культуры раней прыгнечаных народаў.

Наш рост, нашы дасягненьні выклікаюць шалёную нянавісьць да нашай краіны з боку капіталістаў і іх урадаў. Капіталістычны сьвет рыхтуе новы напад на Савецкі Саюз, рыхтуецца задушыць краіну сацыялізму.

Асабліва яркія прыкмеры падрыхтоўкі да вайны мы наглядаем ў фашысцкай Польшчы, якая са страшэннымі азьвярэньнем ачышчае свой тыл, душыць кожнае праяўленьне рэвалюцыйнага руху рабочых і працоўных мас, ужываючы ў клясавай барацьбе з пралетарыятам нябачаныя ў гісторыі мэтады тэрору, катаваньняў і зьдзекаў.

У часе калектыўнага пратэсту палітзьняволеных Петраюўскай катаржнай турмы, галадаючых палітзьняволеных зьвязалі па два чалавекі сьпіною адзін да другога і выкручвалі рукі.

У Пінскай турме — 17-гадовага цяжка хворага Прыжыбільскага, які ляжаў у гарачцы, сьцянулі ночу з ложка і голага кінулі ў карцэр на каменную падлогу.

Калі палітзьняволеныя Стэфанкай турмы прабавалі пратэставаць супроць таго, што на вокнах іх камэр былі павешаны бляшаныя шчыты, на іх выкінулася цэлая зграя турэмных наглядальнікаў, біла іх прыкладамі, нагамі і кулакамі, а пасьля гэтага яны былі пазбаўлены харчовых пасылак з волі, кніг, газэт, прагулак. Калі зьявіленьня абвясьцілі галадоўку, дык зьдзекі і катаваньні яшчэ больш павялічыліся. На 3-ці дзень галадоўкі пачалі штучнае кармленьне праз гумавую кішку, запушчаную ў страўнік. Пры гэтым, на кожнага таварыша навальвалася па некалькі турэмных наглядальнікаў, якія выкручвалі рукі і ногі.

Кроў стыне ў жылах, калі чытаеш пісьты, што прыходзяць з фашысцкай Польшчы — гэтай турмы народаў. Крывавыя расправы, гвалтаваньні палітзьняволеных жанчын, наўмыснае заражэньне венэрычнымі хваробамі, пагалоўнае зьбіеньне ўсяго насельніцтва цэлых вёсак, як напрыклад, Запольне, Карэлічы і інш. — вось малюнак становішча працоўных у бела-панскай Польшчы.

Усе гэтыя зьдзекі павялічваюцца нацыянальным прытнечаньнем на акупаванай тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Мы заклікаем вас, рабочыя і работніцы капіталістычнай Англіі стаць магутнай пралетарскай сьцяной у абарону нашых польскіх, беларускіх і украінскіх братоў па клясе, якія стогнуць пад гнётам польскага фашызму.

Выходзьце на вуліцы! Пратэстуйце супроць аднаўленьня паміраючым капіталізмам сярэдняв'яковых зьвярстваў. Патрабуйце спыненьня мук працоўных у Польшчы, арганізуйце масавыя зборы сродкаў у дапамогу палітзьняволеных і іх сем'ям.

Правядзе дзейсныя ўзоры інтэрнацыянальнай салідарнасьці пралетарыяту, як вы ня раз праяўлялі іх раней.

Няхай жыве Камуністычны Інтэрнацыянал — правадыр сусьветнага пралетарыяту, штаб сусьветнай рэвалюцыі!

Пралетары ўсіх краін, злучайцеся!

РАБОЧЫЯ ФАБРЫКІ «ВЕЗУВІЙ».

ПРАЦОЎНАЕ СЯЛЯНСТВА УЗМАЦНЯЕ БАРАЦЬБУ СУПРОЦЬ ФАШЫСЦКІХ ГРАБЕЖНІКАЎ

ВАРШАВА, 25. Задыхаючыся пад дыктатурай фінансавых труднасьцяй, польскі фашызм распачаў літаральна грабежніцтва працоўнага насельніцтва вёскі.

Імкнучыся выратавацца ад фінансавага банкрутства, якое шпаркімі тэмпамі набліжаецца, фашысцкая ўлада накладае вялізарныя падаткі, якія ўзрастаюць з кожным годам. Фашысцкая «Газэта Варшаўска» ў № 34 падае характэрныя даныя ад крывой росту падаткаў. Калі ў 1926 годзе ў фашысцкай Польшчы на чалавека прыпадала падаткаў 54 злотых, дык у 1927-28 годзе — ужо 85 злотых, у 1928-29 годзе — 93 злотых, а ў 1929-30 годзе — 100 злотых. У бягучым, 1931 годзе, з прычыны вялізарнага бюджэтнага дэфіцыту, які ў адным чэрвені месяцы дасягнуў 44 млн. злотых, фашысцкая ўлада павялічыла падатковыя цяжары да нячуваных размераў.

Сялянства, зруйнаванае аграрным крызісам і фашысцкай зямельнай рэформай, масава адмаўляецца ад плацяжу падаткаў. З прычыны гэтага ў вёску хлынула армія экзэкутараў і сэквэстратараў, якія дзікімі спосабамі выдзіраюць падаткі, распрадаючы апошнюю сялянскую маемасьць. У адказ на гэта сяляне, пад кіраўніцтвам кампартыі, даюць арганізаваны адпор, ствараючы камітэты сялянскай барацьбы.

У вёску Гржэзойка, Сасноўскага павету прыбыў экзэкутар у суправаджэньні некалькіх паліцэйскіх з мэтаю спагнаньня падаткаў. У бедняка Літэўкі, у якога не знайшлося грошай, ён пачаў забіраць хатнія рэчы. Абураныя сяляне каменьнямі выгналі з вёскі грабежнікаў.

На другі дзень у вёску прыехала некалькі дзесяткаў паліцэйскіх, якія, правёўшы жорсткую расправу, арыштавалі некалькі сялян.

Фашысцкая ўлада, бачачы, што барацьба супроць падаткаў прымае ўсё больш арганізаваны характар, пачалі масавы тэрор. У в. Будзівуй, Гржэшоўскага павету, паліцыя арыштавала 67-гадовага старыка А. Бомбу — члена праўленьня сялянскай ліпіцы, а таксама яго жонку. У 12 вёсках гэтага павету ахранка правяла масавыя арышты. Усе арыштаваныя былі страшэнна катаваны. Імкнучыся ўхіліцца ад арыштаў, сяляне масава ўцякаюць у вакольныя лясы.

ПРАЛЕТАРЫ ФРАНЦЫІ!

Рука ката занесена над жыцьцём 10.000 лепшых прадстаўнікоў рабочае клясы і працоўнага сялянства Польшчы

Рабочыя гомельскіх заводаў „Пралетары“ і Гомсельмаш заклікаюць вас да абароны палоньнікаў фашызму

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Скрозь турэмныя краты, праз сьцены польскай дэфэнзывы, праз межы так званай «дэмакратычнай рэспублікі» пана Пілсудзкага даносяцца да нас стогны ахвяр фашысцкага тэрору, нашых братоў па клясе. Дзесяць тысяч лепшых прадстаўнікоў рабочай клясы і працоўнага сялянства Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны мучацца ў засьценках польскага фашызму, церпяць нечалавечыя мукі, пераносяць самыя зьвярэрскія катаваньні і зьдзекі. Польскі фашызм, які літаральна задыхаецца пад ударамі эканамічнага і палітычнага крызісу, шукае выхаду ва ўзмоцненым наступленьні на рабочую клясу і працоўныя масы, у канчатковым задушэньні рэвалюцыйнага руху і ў падрыхтоўцы вайны супроць Савецкага Саюзу.

Нашы перамогі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, нашы посьпехі ў ажыцьцяўленьні пяцігодкі за чатыры гады, калектывізацыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі на яе аснове кулацтва, як клясы, выклікаюць з боку капіталістаў шалёную нянавісьць да Савецкага Саюзу, асабліва з боку фашысцкае Польшчы.

Рабочая кляса, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, будуючы і пускаючы ў ход гіганты індустрыі — заводы і фабрыкі, магутныя электрастанцыі, пускаючы на колгасныя палі новыя тысячы трактараў, паляпшаючы штодзенна матар'яльныя і культурныя ўмовы рабочых і калгаснікаў, — заражае сваім прыкладам рабочых і сялян капіталістычных краін.

Працоўныя Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны, якія знаходзяцца на рубяжы капіталістычнага і сацыялістычнага сьветаў, задыхаюцца ад нечалавечай эксплёатацыі польскіх памешчыкаў і фабрыкантаў, ад непасільных падаткаў польскага ўраду. Даведзеныя калёніяльнай палітыкай акупантаў да голаду і жабрацтва, яны падымаюцца на барацьбу супроць крывавай фашысцкай дыктатуры.

У адказ на гэта польскі фашызм узмацняе тэрор. Піпсудчыкі аднавілі катаваньні сярэднявечнай інквізыцыі і царскай апрычніны.

Працоўныя Польшчы, Зах. Беларусі і Украіны масава арыштоўваюцца і катуюцца ў ахранцы самым нячуваным чынам: уліваньне вады і мачы ў нос, зьбіваньне жалезнымі палкамі па пятах, паманьне касьцей, гвалтаваньні жанчын, сьмяротныя прыгавары, шматгадовыя катаржныя прысуды, — вось лёс кожнага працоўнага, які адважваецца абараняць свой кавалак хлеба, які адважваецца змагацца супроць капіталістычнага ўціску.

Польскія каты імкнуцца фізічна зьнішчыць рэвалюцыйны авангард. З гэтай мэтай фашысцкім урадам быў выдан новы турэмны рэгламант, які зьнішчае нават тыя мізэрныя прывілеі для палітзьняволеных, якія існавалі пры царызме (напрыклад, права падсылкі харчоў, права мець кнігі і інш.). ПАТОКАМІ КРЫВІ, МАСАВЫМ ТЭРОРАМ І ЗЬНІШЧЭНЬНЕМ ЛЕПШЫХ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА ВЫЗВАЛЕНЬНЕ ПРАЦОЎНЫХ, ФАШЫСЦКІ ЎРАД ПОЛЬШЧЫ ХОЧА ЎСТАНАВІЦЬ МАГІЛЬНУЮ ЦІШЫНЮ Ў ЗАХ. БЕЛАРУСІ і Зах. Украіне, каб забясьпечыць для сябе тыл для нападу на Савецкі Саюз.

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ! Па ўсёй Савецкай Беларусі і ўсім Савецкім Саюзе пракаціпася магутная хваля глыбокага абурэньня супроць гэтай крывавай оргіі, МЫ, РАБОЧЫЯ ГОМЕЛЬСКІХ ЗАВОДАЎ «ПРАЛЕТАРЫ» І ГОМСЕЛЬМАШ ЗАКЛІКАЕМ ВАС, ПРАЦОЎНЫХ ФРАНЦЫІ І ЎСЯГО СЬВЕТУ, ДАЛУЧЫЦЬ СВОЙ ГОЛАС ПРАТЭСТУ СУПРОЦЬ НЯЧУВАНЫХ У ГІСТОРЫІ ЗЬДЗЕКАЎ НАД РЭВАЛЮЦЫЙНЫМІ БАРАЦЬБІТАМІ.

ВЫХОДЗЬЦЕ НА ВУЛІЦЫ! ПАТРАБУЙЦЕ АД ПОЛЬСКАГА ЎРАДУ СПЫНЕНЬНЯ НЯБЫВАЛЫХ РАСПРАЎ НАД ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫМІ. Мы спадзяемся, дарагія таварышы, што вы ня будзеце стаяць у баку ад гэтых падзей.

ЧАКАЕМ ВАШАГА ЎДЗЕЛУ, ВАШАЙ ДАПАМОГІ.

Няхай жыве інтэрнацыянальная салідарнасьць пралетараў усіх краін!

Няхай жывуць нашыя браты—палітзьняволеныя!

Няхай жыве пралетарыят Францыі і яго правадыр КПФ!

НОВЫ УЗДЫМ РЭВАЛЮЦЫЙНА-ВЫЗВАЛЕНЧАЙ БАРАЦЬБЫ У ЗАХ. УКРАІНЕ

ВАРШАВА. Заходняя Украіна зноў робіцца арэнай нябачанай па сваёй жорсткасьці нацыянальна-вызваленчай барацьбы. Працоўнае сялянства масава ўзьнімаецца на барацьбу супроць памешчыцкага ўціску, супроць фашысцкай акупацыі. Увесь буржуазны друк стражаніць паведамленьнямі аб падпалах панскіх маёнткаў, сьцірдкай збожжа, аб масавых актах «сабатажу».

Як паведамляе «Газэта Варшаўска» ў №259, 22 жніўня каля Барыслава невядомымі асобамі, перарэзаны тэлеграфныя правады. У сувязі з гэтым арыштавана некалькі сялян. Перарэзаны праводы таксама каля Схадніч. Арыштавана 3 асобы.

З Львова паведамляюць аб значнай пакражы ваеннай амуніцыі (вінтовак, рэвальвэраў і інш.), якая была зроблена ў памяшканьні фашысцкага саюзу «Стрэльца». У сувязі з гэтым зроблены шматлікія арышты.

У вёсках Хомск і Радэвічы, у раёне якіх адбываюцца акты сабатажу, паліцыя правяла масавыя вобыскі і арышты. У Бельзе арыштаваны сяляне С. Геля і М. Майск, якія былі заснавальнікамі ліпіцы, у выніку якіх арыштаваны сяляне Семеген, Рыбіцкі, Ставарскі, Ніжнік, Літкевіч і Латоўскі. Усе яны былі адасланы ў Бжэзанскую турму. У той самы дзень у вёсках Верхнія Ліпіцы і Сьвісьцельнікі арыштавана некалькі сялян па падазрэньні ў падпалах.

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“
З серады, 26 жніўня
Зноў на нашым экране
ГАРОЛЬД ЛЁЙД
у новай амэрыканскай камэдыі выпуску 1931 г.
ШПАРКАСЬЦЬ І НАЦІСК
камэдыя ў 8 частках.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
ТРЫМАЙ ЗЛОДЗЕЯ
фільм у 1 частцы.
ПАЧАТАК а 7, 8-45 і 10-30 г.
Каса—ад 5 гадз.
Цэны месцаў з 24-VII ЗНАЧНА ПАМЕНШАНЫ.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“
адкрыта з 12 гадз. дня.
СЁНЬНЯ, 26-га жніўня штодзённа
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
па нашумеўшым рамане ФЭРДЫНАНДА ДЗЮШЭНА „Малады месяц“
ПРАКАЖОНАЯ
ДРАМА ў 8 ЧАСТКАХ.
Рэжысэр АЛЕГ ФРЭЛІХ.
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ: А. Файт, Г. Чачалашвілі, Пір-Мухамедаў.
ПАЧАТАК ДЗЕННЫХ СЭАНСАЎ у 2 гадз. і ў 3 гадзіны 45 мін.
ВЯЧЭРНІЯ СЭАНСЫ: у 7 гадз., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м.

РАБФАК хэміка-тэхналёгічнага інстытуту абвяшчае, што прыём заяў на першы курс ПРАЦЯГНУТ да 10 ВЕРАСЬНЯ.
Правілы прыёму, даведкі і прыём заяў у канцылярыі рабфаку ад 9 да 4 гадз. (Менск. Зямляробскі зав. №3).
ДЭКАНАТ РАБФАКУ.

Інстытут Савецкага Будаўніцтва і Права паведамляе, што ПРЫЁМ ЗАЯЎ ПРАЦЯГНУТ да 10 верасьня г.г.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ у плянава-эканамічны інстытут ПРАЦЯГНУТ да 1-IX—1931 г.
Нажэсьнік дырэктара САЦУНКЕВІЧ.

Кіно „КУЛЬТУРА“
Ад 26-га жніўня
Новы выдатны мастацкі бытавы фільм
2 МАТКІ 2
драма ў 6 частках
У галоўных ролях
АРТЫСТЫ:
ЦЭСАРСКАЯ, КАЗАНАВА, ЮРЭНЕУ, КАПРАЛАУ і ЛЯВІЦКАЯ
Роль 1-й маткі выконв. арт. Л. КАЗАНАВА
„ 2-й „ „ „ ЦЭСАРСКАЯ
Кошт білетаў ПАМЕНШАНЫ
КАРЦІНУ ІЛЮСТРУЕ АРКЕСТР.
Каса адкрыта з 5 гадз.
Пачатак сэансаў у 7, 8.45 і 10.30 г.

„Інтэрнацыянал“ Пач. 1 с. у 7 ч. в. МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ПАЎНОЧНАЕ НАХАЛЬНЕ драма ў 7 частк. Звыш праграмы кіно-часоп. БДН № 14.
„Юны Піянэр“ (будынак кіно „Культура“) С 22 жніўня САВУР МАГІЛА Пачатак з 1 г. дня
„СПАРТАК“ Пач. 6-30, 8.9-30 і 11 Каса—з 5 гадз. Ігар Ільінскі у карціне ЛЯЛЬКА З МІЛЬЁНАМІ камэдыя ў 6 частках

ЗРЫ БЕЛ. ТОРФ. ІНСТЫТУЦЕ АДКРЫВАЮЦЦА падрыхтоўчыя 3-месячныя КУРСЫ на 60 асоб.
Прымаюцца з адукацыяй 6 гр. самігодкі, іншыя трымаюць іспыты.
Прымаюцца рабочыя, дзеці рабочых і калгаснікаў выт. стажам ня менш 3-год.
Патрэбна прадстаўленьне дакумэнтаў, згодна агульных правіл прыёму.

СТУДЭНТЫ ўсіх курсаў плянава-эканамічнага інстытуту павінны зьявіцца 30-га жніўня 1931 г.
Нам. дырэктара САЦУНКЕВІЧ.

Бюро ІТР і калектыў ЛКСМБ Дзяржпляну АРГАНІЗУЮЦЬ СЫСТЭМАТЫЧНУЮ КАНСУЛЬТАЦЫЮ для плянава-эканамічных груп БССР.
Кансультацыя пачнецца 28 жніўня 1931 г.
ДЭЖУРСТВЫ будуць праводзіцца па чотных лічбах ад 18 да 20 гадзін.
Па ўсіх пытаньнях працы плянава-эканамічных груп, як у нутрэнай, так і ў пісьмовай форме зварачацца ў Дзяржплян БССР—Менск, пляц Волі № 5, пакой № 6.
Бюро ІТР і бюро калектыву ЛКСМБ Дзяржпляну.

Горшанскі тэхналёгічны мяса-прамысловы тэхнікум абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР з 1 жніўня па 15-е верасьня.
Дакументы, згодна даведніку НКА, прымаюцца ў канцылярыі тэхнікуму па адрасе: г. Горшы, Ленінская, 16. Тэхнікуму Шкоцкой прамысловасьці. Да дакумэнтаў трэба прымацаваць паштовых марак на 20 кап.
Дырэктар тэхнікуму Шэйніна.

Даводзіцца да ведама ўсіх паступаючых ва Ўсебеларускую Саўпартшколу, што прыймовыя іспыты пачнуцца з 1-га кастрычніка 31 г.
Усе таварышы, якія атрымалі паведамленьні аб дапушчэньні да прыймовых іспытаў, павінны прыехаць ў Саўпартшколу (Гомель, парк імя Луначарскага) 1-га кастрычніка.
Нач. Загадчык Саўпартшколы Кулікаў.

СТУДЭНТЫ УСІХ КУРСАЎ Беларускага Дзяржаўнага Фінансава-Эканамічнага Інстытуту ПАВІННЫ ЗЬЯВІЦЦА на заняткі 1-га верасьня ў 8 гадз. раніцы.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ у Беларускі Дзяржаўны Інстытут Прадзільных Культур на 1-шы курс працягнут да 10 верасьня 1931 г.
Іспыты праводзяцца з 15 па 25 верасьня 1931 г.
Заняткі распачынаюцца з 1-га кастрычніка 1931 г.
Заявы з дакумэнтамі накіроўваць па адрасе: г. Горкі, Дзяржаўнаму Інстытуту Прадзільных Культур.
Дырэктар Інстытуту Брытаў.

Беларускі Інстытут спажывецкай кааперацыі паведамляе, што прыём заяў на асноўны курс інстытуту працягнут да 5 верасьня.
Умовы прыёму абвешчаны ў газ. „Зьвязда“ ад 25-VII-31 г.
Заявы з дакумэнтамі накіроўваць па адрасе: г. Менск, Беларкаапсаюз, сэктар кадраў.
Дырэкцыя Інстытуту.

Кошт публікацыі аб згубе 1 дакумэнту 1 р.

Макданальд на чале „нацыянальнага ўраду“

«Рабочы» ўрад у Англіі падаў у адстаўку. Уход «рабочага» ўраду выклікан становішчам надзвычайна абвостранага крызісу ва ўсёй Брытанскай імпэрыі. Другі інтэрнацыянал вітаў прыход да ўлады «рабочага» ўраду, як вялікую перамогу дэмакратызму і сацыялізму». Ён абяцаў рабочым, што «рабочы ўрад «зьяцьцёвіць» далёка ідучыя сацыялістычныя мерапрыемствы, што ён палепшыць эканамічнае і палітычнае становішча рабочай клясы. Паслужны сьпіс «рабочага» ўраду сьведчыць аб поўным банкрутстве ўсіх гэтых абяцаньняў, аб поўным банкрутстве «канструкцыйнага сацыялізму».

Перавыбарчую кампанію партыя Макданальда і генэральная рада трэд-юніёнаў праводзілі над лёзунгам барацьбы з беспрацоўем, за ўстанаўленьне 7-гадзіннага рабочага дня для гарнякоў, прымяненьня з калёніямі, усеагульнага разбраеньня, паляпшэньня сацыяльнага заканадаўства.

Якія-ж посьпехі ўраду Макданальда ў галіне барацьбы з беспрацоўем? Калі габінэт Макданальда прышоў да ўлады, у Англіі налічвалася 1.100 тыс. беспрацоўных, цяпер калі габінэт выходзіць у адстаўку, у Англіі налічваецца 2.700 тысяч беспрацоўных.

Буржуазія рукамі «рабочага» ўраду праводзіла нячуванае ў гісторыі Англіі наступленьне на зарплату рабочых. Паводле даных міністэрства працы самога ўраду, скарачэньне зарплаты за першыя 6 месяцаў 1931 г. закранула больш 2 млн. ангельскіх рабочых.

Урад Макданальда абяцаў аднаўленьне 7-мі гадзіннага рабочага дня гарнякоў, але ён ня выканаў свайго абяцаньня. Гарнякі ўсё яшчэ працуюць больш 7½ гадзін, а месцамі і 8 гадзін. Паляпшэньне сацыяльнага заканадаўства выявілася між іншым у тым, што сотні тысяч беспрацоўных пазбаўлены дапамогі. Уся замежная палітыка «рабочага» ўраду была палітыкай імпэрыялізму, якая вяла не да скарачэньня, а да ўзмацненьня ўзбраеньня і падрыхтоўкі новых войн. Толькі пасьля доўгіх хістаньняў урад пад націскам мас аднавіў, спыненыя кансэрватарамі, дыпляматычныя зносіны з СССР. Але ён не аказаў падтрыманьня прапановам ураду СССР, накіраваных да сапраўднага разбраеньня і сапраўднага міру. Разам з другімі буржуазнымі ўрадамі ён адхіліў гэтыя прапановы.

Калёніяльная палітыка заключалася ў прыцягваньні палітыкі кансэрватараў. Нацыянальны рух пасьлядоўна задушаўся ў Індыі, у Егіпце, у Паўднёва-Афрыканскім саюзе, Палестыне, на Арабскім Усходзе, у Нігерыі, Кеніі, Гамбіі (у нэгрыцянскай Афрыцы). Больш ці менш новае ў галіне калёніяльнай палітыкі заключалася толькі ў тым, што «рабочы» ўрад шукаў збліжэньня з нацыянал-рэфармісцкімі плынямі ў калёніяльных краінах. Жорсткія рэпрэсыі ў адносінах да рэвалюцыйнага руху і неяпікія ўступкі рэфармістам ва ўзнагароду за іх падтрыманьне — вось сэнс калёніяльнай палітыкі «рабочага» ўраду.

Што-ж прывяло да адстаўкі «рабочы» ўрад? Калі меркаваць паверхоўна, дык гутарка ішла як быццам аб збалянсаваньні бюджэту. У бюджэце выявіўся дыфэцыт у 120 млн. фунтаў стэрлінгаў. Біржа і Лёнданскае сіці з яго банкірамі патрабавала збалянсаваньня бюджэту. Паўстала пытаньне аб тым, ці скарачаць дапамогі бяднейшым з бедных —беспрацоўным на 20 або 10 проц., ці ўвесьці ўвозныя мыты, на 10 проц. абкласьці даходы дзяржаўных аблігацый. Адразу-ж сярод ураду ўзьніклі разгалосьсі.

Паміж трыма партыямі брытанскай буржуазіі таксама як быццам меліся разнагалосьсі: лібэралы выступалі супроць увядзеньня мытаў, чаго патрабавалі кансэрватары. Затое і кансэрватары і лібэралы патрабавалі, каб рабочая кляса прынесла 75 проц ахвяр, а буржуазія толькі 25 проц. А Макданальд адстойваў той пункт погляду, што буржуазія павінна несьці 50 проц. «ахвяр» і пралетарыят — 25 проц.

Было-б аднак наіўным думаць, што прычына адстаўкі габінэту і стварэньня новага—«нацыянальнага» ўраду хаваецца ў гэтых спрэчках. Эканамічны крызіс напёс жорсткі ўдар усёй Брытанскай даяржаве, якая разьвіваецца па ісходзячай лініі ўжо 10 год. Падзеі на нямецкім рынку патрасьлі і Лёндан. У Англіі ў сваю чаргу нарастае фінансавы крызіс, банк паслабеў, яго залатыя запасы таюць. Амэрыканская эканамічная часопісь «Комэрсыэль оф Кронікль» ня без падставы ўказвае на тое, што ў Англіі пагроза больш вялікая, у параўнаньні з становішчам спраў у Нямеччыне. Лёндан — сусьветны банкір.

Макданальд вышаў у адстаўку і ў Англіі ствараецца каліцыйны ўрад з ўсіх трох партый брытанскага ўраду, —з «рабочай», кансэрватыўнай і лібэральнай партый. У склад ураду ўваходзяць буйнейшыя дзеячы гэтых партый —Макданальд, Балдуін, Сноўдэн і ад лібэралаў з прычыны хваробы Лёйд-Джорджа, Фэрбэль, Самуэль. Пры гэтым Балтуін і намесьнік Лёйд-Джорджа адмовіўся фармаваць габінэт, а прымаюць удзел у ім толькі пад кіраўніцтвам Макданальда. Такі каліцыйны ўрад існаваў у Англіі толькі ў часе вайны.

Каліцыйны ўрад на чале з Макданальдам павінен павесьці далейшае наступленьне на ангельскі пралетарыят, на заработную плату, на сацыяльнае заканадаўства, каб зрабіць ангельскую прамысловасьць канкурэнтна-здольнай за кошт пралетарыяту. У гэтым няма і ня будзе ніякіх сумненьняў.

Пад лёзунгам «грамадзянскага міру», пад лёзунгам нацыянальнага адзінства, буржуазія праводзіць шырокае наступленьне на рабочую клясу. Няма нічога дзіўнага ці нечаканага ў тым, што «рабочая» партыя дапамагае ў гэтым буржуазіі, ажыцьцяўляючы яе праграму. У гэтым цяпер яе значэньне і роля.

Належыць, аднак, адзначыць новы манэўр лейбарысцкай партыі ў тым самым, і ангельскай буржуазіі. Новы ўрад Макданальда, тыя члены старога ўраду, якія былі зьвязаны з прафсаюзным рухам, якія прадотаўлялі ўнутры ўраду прафсаюзы і генэральную раду—выплілі з ураду, прычым напырыліся весьці тым, што гэтыя міністры Гендэрсон, Клейнс, Лансбэры, Бонфітд і іншыя рэчылі супроць скарачэньня дапамогі беспрацоўным, «абараняілі» рабочых і тарэсы, патрабавалі нібы пераканаць галоўнага цяжару крызісу на буржуазію. Можна ня сумняваецца ў тым, што яны будуць выдаваць сябе як барацьбітоў за рабочую справу. Можна ня сумняваецца ў тым, што генэральная рада прафсаюзаў і левыя з «рабочай» партыяй і ў асаблівасьці найбольш хітрыя і кмітлівыя, больш небясьпечныя з незалежнай «рабочай» партыі будуць разьгрываць, а па нотах, апазыцыю да каліцыйнага ўраду яго вялікасьці, тым самым яны будуць прабаваць ашукаць рабочых, адцягнуць іх ад сапраўднай барацьбы супроць наступленьня і ад арганізацыі контр-наступленьня пралетарыяту.

Ствараецца каліцыйны ўрад для прадвядзеньня наступленьня на рабочую клясу, а ў той-жа час «левыя» з рабочай партыі, «незалежная рабочая партыя» і рэфармісты з генэральнай рады прафсаюзаў прабуюць узначаліць рабочых, каб абезглавіць іх барацьбу супроць наступленьня капіталу, каб дзяржаваць гэтую барацьбу, каб разбіць рабочую клясу.

У Англіі надыходзіць вялікія клясовыя бані. Лёзунгам нацыянальнага адзінства буржуазія прабуе прыкрыць сваё наступленьне на пралетарыят.

Вязумоўна, што замежная палітыка новага ўраду яшчэ больш абвострыць палітычныя супярэчнасьці.

Ангельская камуністычная партыя стаіць перад вялізарнейшымі задачамі. Яна лічыць неабходнымі выкрываць манэўры «рабочай» партыі і генэральнай рады трэд-юніёнаў. Ангельскія камуністы стаяць перад сабой задачу выступіць сапраўднымі кіраўнікамі барацьбы брытанскага пралетарыяту супроць наступленьня капіталу, арганізаваць контр-наступленьне пралетарыяту супроць наступленьня каліцыйнага ўраду з удзелам «рабочай» партыі. Да гэтай пары кампартыя Вялікабрытаніі вельмі слаба мабілізавала рабочыя масы на аснове гэмбокага абвастрэньня клясавай барацьбы, зьвязанай з крызісам. Рабочая кляса Англіі не зрабіла яшчэ неабходных высноў з свайго цяжкага становішча.

Адкрыты саюз Макданальда з Балдуінам і Лёйд-Джорджам выкрывае «рабочую» партыю перад масамі і аблягчае камуністам выкананьне іх задач («Праўда»).

Знайсьці і пакараць вінаватых!

«Зьвязда» ад 20 жніўня ў артыкуле «Да адказу» і прынісцы ад рэдакцыі выказала надзею, што нам прыдзецца апошні раз напамінаць органам пракуратуры пра справу тав. Ханіна. Патрабуем выкрыцьця цалкам тэзу справу «на працягу бліжэйшых-жа дзён».

І сапраўды пракуратуры прышлося напамінаць апошні раз. Справа сьледзтвам закончана і перадана ў працэсію для прыцягненьня да адказнасьці кіраўчага работніка Белдзяржкіно Матусава.

Аднак, патрабаваньні «Зьвязды» наконт канчаткова выкрыцьця справы і зараз патрабаваньнем. За 6 дзён, якія прайшлі з часу зьмяшчэньня артыкулу зьявілася ў сьвет рэзалюцыі бюро парт'ячэйкі па справе тав. Ханіна.

Вось на зьмесьце гэтай рэзалюцыі і на тых «пакутах», у якіх яна нараджалася мы і думаем спыніцца ў гэтым артыкуле:

Два дні засядала бюро. Два дні члены бюро і адказныя работнікі (камуністы) Белдзяржкіно «метали гром і молнии» па адрасе...

Вы думаеце тых, хто зьдзекваўся на працяту гадоў над напалову бясспрыхаваньня рабіў з маладога хлапчука «мальчика» для пабягушак. Хто з выпынь дырэктарскага габінэту спакойна назіраў за гэтым бясчынствам? Нічога падобнага.

Пачынаючы ад кіраўніка Белдзяржкіно тав. Галкіна, які рабіў інфармацыю і канчаючы астатнімі членамі бюро, якія больш ці менш вінаваты ў гэтай справе—усе яны на ўсякія лады ўсялякімі спосабамі імкнуліся выгарадзіцца. «Я ня я і хата не мая».

Для таго, каб гэта гучэла больш пераканаўча, людзі не скупіліся сваю прамову ўпрыгожыць цэлым радам эпітэтаў. Член бюро ячэйкі, загадчык складу Курганаў становіцца ў позе пакрыўджанага і з абурэньнем пускае па адрасе Ханіна такія слоўкі, як «шантажыст», «ня пускаць яго праз парог Белдзяржкіно» і інш.

Галкін лічыць сябе зусім «сьвятым, які ня мае ніякага дачыненьня да справы датычаць павінны зьяўляцца. Выклікаюцца рабочыя засядацелі т. т. Розін, Савіцкая, Якаўлеў — зав. «Камунар». Шпакоўская, Бандарчук, Лілеўская — зав. «Бальшавік», Шымкевіч, Канер, Саломін — «Чырвоны Тэкстыльшчык», Пэўзнэр, Маўновіч, Аксельрод, Гайдукевіч — ф-ка «Кастрычнік». Запрашаецца актыў «ЛК» і рабкоры.

ПАПРАЎКА.

Ва ўчарашным нумары «Зьвязды», на 4-ай старонцы ў заметцы «З пад фашысцкага ўціску — у краіну свабодных» прапусцена — прапушчана ў часе вёрстки подпіс: (БЕЛТА).

Паведамленьні

— Дом Камуністычнай Асьветы імя Карла Маркса. 26 жніўня ў 7 гадз. вечара — групавая кансультацыя для членаў рэдкалегіі «Нізавы друк у барацьбе за выкананьне фінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі».

— 26 жніўня, у 6 г. веч., у памяшк. Бюро Скартаў ЦКК-НКРСІ БССР (Савецкая 55, 1-шы паверх) адбудзецца пасяджэньне Аб'яднанага Бюро Скартаў ЦКК-НКРСІ з разглядам наступных спраў: 1) Справа партыз. кам. крамы № 25. 2) справа Ільіновіча П., 3) справа Біліна, 4) справа Мяцельскага, 5) справа Радзіёнава, 6) справа інж. Менжынскага. 7) справа Ганцэўскага, 8) справа Эмануіла, 9) справа Верапкоўскай. Выклікаецца прадстаўнік ЦК саюзу працасьветы. Усе т. т., якіх гэтыя справы датычаць павінны зьявіцца.

ПАПРАЎКА.

Адказны рэдактар—С. БУДЗІНСКІ.

28-га ЖНІЎНЯ, у 8 гадзін. раніцы
Гарпрафсавет, сумесна с рэдакцыяй „Рабочий“
склікае
нараду старшынь ФЗМК гораду,
)—(па пытаньнях:)—(
1) ход праверкі калдагавору,
2) аб уборцы ў прыгарадных гаспадарках.
Яўка павінна быць сваячасовая і абавязковая.
Гарпрафсавет і рэдакцыя „РАБОЧИЙ“.

Менск, друкарня «Зьвязды».
Галоўлітбел № 337.